

Ваенныя тапографы маюць уласную друкарню

СТАР. 3



Што шкодна для нашага зроку

СТАР. 6



Недзіцячыя хваляванні на праекце «Я спяваю»

СТАР. 8



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ВЕРАСНЯ 2014 г. СЕРАДА № 181 (27791) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## МАБІЛЬНАСЦЬ, КІРУЕМАСЦЬ, ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

### Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ставіць задачу стварэння поўнага замкнёнага цыкла вытворчасці перспектыўных узораў узбраення

**Адпаведная гаворка ішла на ўчарашняй нарадзе па гэтым пытанні, паведамляе БЕЛТА.**

«Неабходна аснашчаць нашу армію сучаснай, высокадакладнай і эфектыўнай зброяй, — сказаў Прэзідэнт. — Тэхніка павінна забяспечваць падраздзяленням Узброеных Сіл абароненасць, высокую мабільнасць, кіруемасць, магчымасць весці разведку і наносіць дакладныя агнявыя ўдары на вялікія адлегласці».

«Ніхто не дасць і не прадасць нават за вялікія грошы тое, што нам сёння патрэбна, — перспектыўныя віды ўзбраення. Вы бачыце гэта на прыкладзе нашай суседняй Украіны», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, наколькі гэта важна ў сучасных умовах, можна бачыць на прыкладзе баявых дзеянняў, што адбываюцца.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў словы даўно вядомай мудрасці: «Хочаш міру — рыхтуйся да вайны». «Нам вайна не пагражае на сённяшні дзень, але армію трэба ўзбройваць своечасова, — лічыць беларускі лідар. — Будзем гатовы адказаць на любы выклік часу, у тым ліку і такі, значыць, вайны не будзе. На жаль, аблічча вайны мяняецца. У сувязі з гэтым павінны мяняцца і мы».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў студзені мінулага года ім ужо ставіліся задачы па далейшым развіцці прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу і распрацоўцы новай прадукцыі. Часткова яны былі ўдакладнены ў час наведванняў прадпрыемстваў ВПК у Баранавічах і Барысаве.

«Пэўныя вынікі ў гэтай сферы быццам бы дасягнуты. Сёння айчыннымі арганізацыямі асвоены капітальны рамонт і мадэрнізацыя практычна ўсёй лінейкі авіяцыйнай і бранятанкавай тэхнікі, сродкаў і сістэм ППА, радыёлакацый, апаратуры радыёэлектроннай разведкі і радыёэлектроннай барацьбы», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. «Новая тэхніка сёння катастрафічна дарагая, і многія дзяржавы ідуць па шляху ўдасканалення, мадэрнізацыі старых узораў узбраення, калі яны для гэтага прыдатныя», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі створаны доследныя ўзоры баявой браніраванай машыны і аўтамабіля высокай праходнасці, наладжана вытворчасць сродкаў сувязі. Акрамя таго, завершана распрацоўка беспілотнага авіяцыйнага комплексу з далёкасцю дзеяння 100 і больш км. Сумесна з замежнымі партнёрамі створаны процітанкавы ракетны комплекс. Значны навукова-тэхнічны задзел атрыманы ў мадэрнізацыі і распрацоўцы сістэм ППА, адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, пра запатрабаванасць айчыннай ваеннай прадукцыі на сусветным рынку сведчаць вынікі 7-й Міжнароднай выстаўкі ўзбраення і ваеннай тэхнікі, што адбылася ў ліпені ў Мінску. Так, толькі арганізацыямі, якія ўваходзяць у сістэму Дзяржкамваенпрама, падпісана 55 кантрактаў на агульную суму больш як $350 млн. У цэлым на выстаўцы было заключана дагавораў на суму амаль $700 млн. «Аднак нельга спыняцца на дасягнутым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ



На кірмашы ў Гродне.

Фота БЕЛТА.

*Сезон кірмашоў, які стартаваў у гарадах у мінулыя выхадныя, з нецярпеннем чакаюць усе — і сяляне, і гараджане. Фермеры, прыватныя прадпрыемствы і прадстаўнікі буйных сельгаспрадпрыемстваў не ўпускаюць магчымасці хутка і ў вялікіх аб'ёмах прадаць вырашчаны ўлетку ўраджай, руплівыя гаспадыні спяшаюцца «затаварыцца» на зіму вітамінная якаснай прадукцыяй па прымальных цэнах. Узаемная выгада відавочная, таму на восеньскіх кірмашах, як было і спрадвеку, ні прадаўцоў, ні пакупнікоў, ні садавіны-агародніны не бракуе.*

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзіслаў ЦЫДЗІК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы:**

***«У праекце Закона «Аб барацьбе з карупцыяй», які вынесены ў Беларусі на грамадскае абмеркаванне, неабходна ўлічыць не толькі адказнасць хабарнікаў, але і тых, хто яго дае, прычым адказнасць гэтая павінна быць эквівалентнай. Трэба выключыць са свядомасці людзей нават саму думку аб тым, што для спрыяльнага вырашэння пытання трэба камусьці прапанаваць грошы ці матэрыяльныя каштоўнасці. Калі прапісаць у законапраекце адказнасць двух бакоў, магчыма, гэта спыніць некаторых ад дачы хабару. Грамадзяне нашай краіны ў пераважнай большасці законапаслухмяныя, узровень карупцыі ў Беларусі — адзін з самых нізкіх на прасторы СНД. Пры гэтым дакумент не павінен перашкаджаць стварэнню больш спрыяльных умоў для развіцця эканомікі ў краіне. У барацьбе з карупцыяй таксама важна не перагнуць палку».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.09.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10550,00 | ▲ |
| Еўра | 13570,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 273,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 796,23 | ▲ |

■ Ва ўрадзе

## АЦЯПЛЯЛЬНЫ СЕЗОН ПАЧНЕЦЦА БЕЗ СЮРПРЫЗАЎ

**Неабходныя мерапрыемствы да ацяпляльнага сезона выконваюцца ва ўстаноўленыя тэрміны, поўная гатоўнасць да асенне-зімовага перыяду будзе забяспечана да 1 кастрычніка, паведаміў учора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў намеснік міністра эканомікі Аляксандр ЯРАШЭНКА.**

Галоўнай задачай адпаведных структур да 1 кастрычніка стане выхад на гатоўнасць усіх крыніц энергіі, падкрэсліў **першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА.** Да гэтай даты трэба завяршыць падрыхтоўку цеплакрыніц і спажыўцоў цеплавой энергіі, а кацельні павінны быць укамплектаваны рэзервовым абсталяваннем.

На пасяджэнні Саўміна было адзначана, што на ўзроўні дзяржавы вырашаны ўсе пытанні па пастаўках у краіну нафты і газу па прымальных цэнах. Падпісаны адпаведныя балансы — напрыклад, па нафце на 2015 год у аб'ёме 23 млн т.

Пашпарты гатоўнасці па кацельнях у цэлым па краіне падпісаны на 77%, па спажыўцах цеплавой энергіі — на 72%. Адсталым у гэтым плане рэгіёнам было даручана прыняць неадкладныя меры для своечасовага завяршэння гэтай працы.

**Паводле інфармацыі БЕЛТА.**

■ За акіянам

## АДКРЫТЫ. І ЧАКАЕМ УЗАЕМНАСЦІ

### Наша краіна гатова стаць лепшым месцам для рэалізацыі праектаў амерыканскіх інвестараў

**Падзея, якая некаторымі экспертамі была ўспрынята як адліга ў адносінах паміж дзвюма краінамі, можа і сапраўды стаць фактарам змен у беларуска-амерыканскіх стасунках. Прынамсі, з заяў нашага прэм'ер-міністра Міхаіла МЯСНІКОВІЧА вынікае, што мы цалкам адкрыты для любога супрацоўніцтва і прыехалі з канкрэтнымі прапановамі. Амерыканскі бок быццам таксама не супраць гэтага. У любым выпадку, правядзенне ў Нью-Ёрку беларуска-амерыканскага інвестыцыйнага форуму магло стаць магчымым толькі ў выніку ўзаемных намаганняў і пры гатоўнасці амерыканскага боку садзейнічаць поспеху гэтага мерапрыемства.**

### ПЕРАЗАГРУЗКА

Спецыялісты ўпэўнены, што Беларусь цікавая для амерыканскага бізнесу з пункту гледжання перспектывы інвестыцый. Гэта тлумачыцца наяўнасцю ў краіне кваліфікаваных кадраў, выгаднага геаграфічнага становішча, асабліва ва ўмовах доступу на велізарны еўразійскі рынак.

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч вельмі разлічвае на перазагрузку беларуска-амерыканскіх адносін: «Я шчыра веру ў тое, што, можа быць, з пачаткам гэтага мерапрыемства і шэрагу вялікіх мерапрыемстваў палітычнага характару, якія ініцыявала Беларусь, у тым ліку ў галіне мірнага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне, у нас будзе вялікая перазагрузка адносін паміж Беларуссю і ЗША».

СТАР. 2

## ЦЫГАРЭТА СЯБРУЕ З ТРАГЕДЫЯЙ

### Лік загінулых з-за неасцярожнасці пры курэнні ідзе на сотні




**Упэўнены, што ёсць сацыяльныя звычкі, якія нішто і ніхто з чалавека ніколі не выкараніць. Да курэння ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах многія ўжо адаптаваліся, але хапае і тых, хто па-старому працягвае папыхваць дома. Здавалася б, дарослыя людзі, мудрыя, але часам не хочуць разумець, да якой бяды звычка можа прывесці. Аднак статыстыку не падманеш. Як расказаў «Звяздзе» Руслан ЛІХАМАНАЎ, начальнік аддзела арганізацыі прафілактычнай працы МНС, з пачатку года па прычыне неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні загінулі 270 чалавек!**

—У асенне-зімні перыяд мы кожны год рэгіструем шмат пажараў, звязаных у сельскай мясцовасці з топкай печаў, а ў гарадах — з выкарыстаннем электранагравальных прыбораў, — кажа Руслан Юр'евіч. — Пік прыходзіцца на снежань і студзень. Акрамя таго, з наступленнем халадоў многія людзі больш часу праводзяць дома і для таго, каб «сагрэцца», ужываюць алкагольныя напоі, кураць. У стане ап'янення людзі наогул забываюцца на асабістую бяспеку. І часта яны гінуць у выніку курэння, неасцярожнага абыходжання з агнём. Нярэдка чалавек кладзецца ў ложак (або ўсаджваецца ў крэсла), запальвае цыгарэту, глядзіць тэлевізар і засынае. А недакурку неабходна літаральна некалькі секунд на тое, каб запаліць мэблю. Тым больш цяпер, калі пераважная большасць мэблі робіцца з сінтэтычных матэрыялаў. Нават невялікі прапалены астравок на канапе можа прывесці да смерці. Уявіце: быццам бы і пажару няма, але чалавек задыхаецца ад прадуктаў гарэння. Літаральна на днях у вёсцы Траўна, што ў Краснапольскім раёне, на пажары загінулі пенсіянеры і іх неаднаразова судзімы сын. Адна з версій — таксама курэнне. Наогул 85 працэнтаў ад усіх пажараў адбываюцца ў кватэрах і прыватных дамах. Сёлета ў жыллёвым фондзе загінулі 425 чалавек, з іх 270 — з-за курэння. Такая вось у нас праблема.

***— Калі «падбівалі» статыстыку, ці звярнулі ўвагу на колькасць загінулых у падобных выпадках маладых людзей?***

— Скажу шчыра, за апошнія гады мы не сутыкаліся з выпадкамі, калі на пажарах па прычыне курэння гінулі дзеці і падлеткі.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Польшча замовіла ў ЗША ўзбраенняў на паўмільярда долараў



Дзяржаўны дэпартамент ЗША ўхваліў магчымы абаронны кантракт з Польшчай коштам 500 мільёнаў долараў. Аб гэтым паведамляецца ў прэс-рэлізе Упраўлення ваеннага супрацоўніцтва Пентагона. Польшча мае намер набыць у ЗША 40 крылатых ракет AGM-158A JASSM, дзве ракеты AGM-158A з комплексам выпрабавальнай апаратуры і сістэмай спынення палёту і дзве ракеты-пустышкі таго ж тыпу. Акрамя таго, польскі бок разлічвае мадэрнізаваць свае знішчальнікі F-16C / D Block 52 для таго, каб тыя маглі несці ракеты AGM-158A. Таксама кантракт прадугледжвае пастаўку запчастак, дапаможнага абсталявання, тэхнічнай дакументацыі, тэхнічную падтрымку і падрыхтоўку польскіх спецыялістаў. Для зацвярджэння здзелкі пагадненне павінен ухваліць Кангрэс ЗША.

### Уведзена новая купюра наміналам у 10 еўра



Еўрапейскі цэнтральны банк з 23 верасня ўводзіць у абарачэнне новую купюру вартасцю ў 10 еўра, паведамляюць інфармагенцтвы. Новая купюра, прадстаўленая яшчэ 13 студзеня ў Франкфурце, называецца «Еўропа» — па імені гераіні старажытнагрэчаскай міфалогіі, дачкі фінікійскага цара Еўропы. Малюнак выкананы ў выглядзе вадзяного знака і галаграмы. Галоўнае адрозненне купюры ад банкнотаў папярэдняга пакалення заключаецца ў абноўленых элементах абароны. Купюры старога тыпу застануцца законным плацежным сродкам. Іх будуць выводзіць з абарачэння паступова.

### Санкцыі ЕС могуць быць перагледжаны 30 верасня

Еўрасаюз 30 верасня можа пачаць пераглядаць санкцыі супраць Расіі. Як паведаміла «Коммерсанту» крыніца ў ЕС, рашэнне па гэтым пытанні будзе прынята на ўзроўні пастаянных прадстаўнікоў краін ЕС у Бруселі. Прэс-сакратар кіраўніка дыпламатыі ЕС Кэтрын Эштан не змагла пацвердзіць гэтую інфармацыю, аднак заявіла, што да 30 верасня знешнепалітычная служба ЕС павінна прадставіць пастаянным прадстаўнікам справаздачу аб выкананні пагаднення па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне і, у прыватнасці, аб выкананні рэжыму спынення агню. Пасля азнаямлення з гэтым дакладам пастаянныя прадстаўнікі павінны будуць вырашыць, што рабіць з санкцыямі. Можа быць абраны варыянт паступовага зняцця абмежаванняў.


ISSN 1990 - 763X

14181>

9 771990 763008


ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Вегетарыянства справакавала эпідэмію дзіцячых захворванняў

Дэфіцыт вітаміну $B_{12}$ — часты дыягназ, які ставяць швейцарскія педыятры. Гэты вітамін адыгрывае важную ролю для развіцця нервовай сістэмы, мозга, у працэсе ўтварэння крыві. Па інфармацыі Федэральнага дэпартамента аховы грамадскага здароўя Швейцарыі, таксама сярод швейцарскіх дзяцей распаўсюджваецца дыстрафія. Прычына ў вегетарыянстве. Паколькі сітуацыя ўжо знаходзіцца на мяжы нацыянальнага крызісу, чыноўнікі вырашылі звярнуцца да бацькоў з заклікам уключаць у рацыён дзяцей разнастайныя прадукты. Толькі мяса, рыба і малочныя прадукты могуць даць поўны набор вітамінаў, мікраэлементаў і іншых карысных рэчываў, важных для дзіцячага арганізма. За апошняе дзесяцігоддзе колькасць вегетарыянцаў у Швейцарыі павялічылася ў 4 разы і складае прыкладна 80000 чалавек. Гэта адразу ж адбілася на росце захворванняў.


## «ЗВЯЗДА» ПРЫЗНАЧАЕ СПАТКАННЕ!

### Паважаныя нашы чытачы!

Завяршаецца падпісная кампанія на 4 квартал 2014 года. І ў гэтыя пахмурныя восеньскія дзянькі мы запрашаем вас на свята — **Свята падпіскі! 25 верасня ў 117-м паштовым аддзяленні сувязі (па адрасе: г. Мінск, праспект газеты «Звязда», 55)** супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» будуць чакаць сваіх падпісчыкаў. Кожны з вас, хто **з 16 да 20 гадзін** у гэты дзень завітае па вышэйназваным адрасе і аформіць падпіску на любое з нашых перыядычных выданняў (а гэта, нагадваем, газеты «Звязда», «ЛіМ», часопісы «Нёман», «Полымя», Маладосць», «Вожык», «Алеся», «Родная прырода»), **атрымае памятны падарунак** ад Выдавецкага дома.

**Чакаем новых падпісчыкаў і нашых сталых чытачоў!**


■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Больш няма газеты з такой адметнай біяграфіяй»



**Аліна ПАХВАЛЁНАЯ, настаўніца беларускай мовы гімназіі №25 г. Мінска:**

— Менавіта газета «Звязда», якую я выпісваю з 1990 года, дапамагла стварыць у гімназіі №25 музей і цэлую сетку экскурсаводаў па раздзеле «Народны побыт».

З дапамогай газеты вучні далучаюцца да нацыянальнай культуры, даведваюцца аб звычаях беларускага народа, навучаюцца традыцыйным рамёствам і сучасным відам творчасці. Настаўнікі гімназіі дзякуючы газеце могуць даць больш аб'ём ведаў па гісторыі Бацькаўшчыны. Газета пранізана чымсьці родным: яна адлюстроўвае пытанні горада і вёскі, усё тое, што хвалюе сапраўдных беларусаў. Журналісты «Звязды» ўмеюць падаць інфармацыю вельмі праўдзіва і справядліва — а гэта галоўнае.

Пра нашу любімую газету мы ведаем значна больш. Кожны год 6 снежня мы адзначаем дзень памяці Рымы Шаршнёвай, якая мела прамое дачыненне да распаўсюджвання падпольнай «Звязды». Штогод 19 мая мы ездзім з нашымі вучнямі, а таксама выпускнікамі даваеннай школы, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, у Любань. Двойчы былі ў партызанскай зоне — на востраве Зыслаў, дзе стаяць аднаўленыя зямлянкі. У адной з якіх друкавалася «Звязда»-партызанка. Невыпадкова вучні пісалі навуковую работу пра газету, узяўшы ў якасці загалоўка назву сумеснага праекта «Звязды» і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Радок «Звязды» ў гісторыі краіны».

Мы сталі неразлучныя з выданнем. Прысвячаем нашай агульнай гісторыі навуковыя працы, ездзім разам у экспедыцыі, у якіх удзельнічаюць не толькі вучні, настаўнікі гімназіі, «звяздоўцы», але і ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, выпускнікі даваеннай 25-й школы імя А. Чарвякова, а таксама родныя патрыётаў-падпольшчыкаў, якія мелі дачыненне да выпуску і распаўсюджвання падпольнай «Звязды».

У Беларусі, а таксама на ўсёй тэрыторыі былога СССР, больш няма газеты з такой адметнай біяграфіяй.

**Запісала Вераніка КАНЮТА.**


*Ідзе падпіска на газету «Звязда» на IV квартал. Заставайцеся з намі — мы пішам пра тое, што сапраўды важна!*

# ВАЖКІ МАГІЛЁЎСКІ КАРАВАЙ

**У сталіцы абласных «Дажынак» — Кіраўску — запрацаваў сучасны цэнтр вольнага часу і з'явіўся бронзавы сімвал свята хлебаробаў**

**Да фінішу ўборачнай кампаніі Магілёўшчына прыйшла з рэкордным для вобласці вынікам — 1393,5 тысячы тон збожжа, у 1,3 раза больш, чым летась. Сярэдняя ўраджайнасць склала 42 цэнтнеры з гектара — на 2,4 цэнтнера болей, чым па краіне. За ўсю гісторыю правядзення фестывалю «Дажынкі» такіх паказчыкаў вобласць дасягнула ўпершыню.**


Лепшыя камбайнеры вобласці Вячаслаў КАРПОВІЧ і Мікалай РАБЦАЎ з ААТ «Александрыйскае».

— За гэтымі лічбамі — самаадданая праца аграрыяў, высокая тэхналагічная дысцыпліна, зладжаная работа ўсіх службаў, занятых на ўборцы ўраджаю, — адзначыў падчас адкрыцця фестывалю старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік. — Гэта падзея аб'яднала ўсіх — будаўнікоў, камунальнікаў, работнікаў культуры і адукацыі. Вялікі паклон усім за найвышэйшую грамадзянскую адказнасць.

Па-сапраўднаму зорным стаў фестываль для аграрыяў Шклоўшчыны. Менавіта гэты раён атрымаў дыплом аблвыканкама першай ступені і 500 базавых велічынь. Адсюль і лепшыя камбайнеры — Вячаслаў Карповіч і Мікалай Рабцаў з ААТ «Александрыйскае», якія паставілі абласны рэкорд па намалоце — 6,6 тысячы тон збожжа.

Падрыхтаваў падарункі для пераможцаў і малочны холдынг ААТ «Бабулін гладыш». Тром лепшым камбайнерам — Уладзіміру Мельнікаву і Уладзіміру Корсаку (агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна), а таксама Вячаславу Карповічу (ААТ «Александрыйскае») уручылі ключы ад пазадарожнікаў «Джылі».

Нельга не адзначыць і працу будаўнікоў і камунальнікаў, дзякуючы якім Кіраўск змяніўся да непазнавальнасці. Цэнтр вольнага часу, на рэканструкцыю якога пайшло больш за 13 мільярдаў рублёў з абласнога бюджэту, стаў сапраўднай візітнай карткай раёна. Тут запрацаваў сучасны 3D-кінатэатр на 160 месцаў, міні-кавярня, хутка адкрыецца більярдная зала. А на ўваходзе ў будынак з'явілася скульптурная кампазіцыя сімвала кіраўскіх «Дажынак» — сноп каласоў. Зроблены капітальны і бягучы рамонты шматкватэрных дамоў, цалкам аднавілася водаправодная сетка, пакладзены асфальт на 8 цэнтральных вуліцах. Шмат аб'ектаў адрамантавана і ў кіраўскай сталіцы раённых «Дажынак» аграгарадку Мышкавічы. Новае жыццё атрымаў мясцовы Дом культуры, у цэнтры населенага пункта запрацаваў фантан, а на 9 вуліцах з'явіўся асфальт. Дарэчы, на рэканструкцыю аб'ектаў сацкультбыту і жыллёвага фонду, а таксама добраўпарадкаванне тэрыторый Кіраўска і Мышкавіч пайшло больш за 100 мільярдаў бюджэтных рублёў. Не менш грандыёзнай была і культурная праграма фестывалю. Тут адбыліся святы хлеба, сала, мёду, бульбы і рыбы. Запрашала алея раённых сцягаў і выстава караваяў. Народ забаўлялі больш як 2 тысячы артыстаў вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# ...ЧАКАЕМ УЗАЕМНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік урада падкрэсліў, што беларускі бок гатовы зрабіць усё, што ад яго залежыць, каб Беларусь стала лепшым месцам для рэалізацыі праектаў амерыканскіх інвестараў. «Мы адкрытыя для дыялогу, гэтак жа, як адкрытая наша краіна, — заявіў ён. — Мы бачым сваю будучыню ў эканоміцы ведаў і інавацыях. Сёння вельмі высокі ўзровень канкурэнцыі, і мы з'яўляемся прыхільнікамі рэальнай адкрытай эканомікі, паслядоўна ідзём гэтым шляхам».

## З ПРЫЦЭЛАМ НА ФІНАНСАВЫ РЫНАК

«Для нас вельмі важны выхад на фінансавы рынак ЗША, і мы вельмі разлічваем на канструктыўную сумесную працу на рынку фінансаў. Нашы дзяржаўныя і карпаратыўныя аблігацыі надзейна забяспечаны і маюць дастаткова высокі ўзровень прыбытковасці. Нам трэба сумесна ісці ў гэтым кірунку», — лічыць Міхаіл Мясніковіч. У прыватнасці, Беларусь вывучае магчымасць размяшчэння ў ЗША аблігацый на 1 млрд долараў. Па словах **намесніка міністра фінансаў Беларусі Максіма ЕРМАЛОВІЧА**, у рамках дэбютных выпускаў беларускіх аблігацый на знешніх рынках ужо ёсць інвестары са Злучаных Штатаў, і яны з'яўляюцца трымальнікамі досыць вялікай долі гэтых каштоўных папер.

Максім Ермаловіч лічыць важнай для беларускіх банкаў і кампаній каціроўку дзяржаблігацый міжнароднымі рэйтынгавымі агенцтвамі. «Мы гатовы зрабіць амерыканскім інвестарам прапанову і правесці ўсе неабходныя мерапрыемствы, каб размясціць выпуск аблігацый на амерыканскім рынку, чаго мы раней не рабілі», — заявіў намеснік міністра.

Акрамя таго, Беларусь прапануе інвестарам з ЗША прысутнічаць на нашым фінансавым рынку. Беларускія прадпрыемствы рыхтуюцца да таго, каб праз механізмы IPO прыцягваць рэсурсы з міжнародных фінансавых рынкаў. Зразумела, што і Нью-Ёрк будзе адным з цэнтраў, дзе нашы прадпрыемствы будуць выходзіць на IPO.

## БІЗНЕС БЕЗ ВІЗ?

«Мы дамовіліся з пасольствам ЗША ў Мінску, што будзем усяляк садзейнічаць рабоце МЗС Беларусі і Дзярждэпартамента ЗША», — заявіў прэм'ер-міністр. Паводле яго слоў, гаворка ідзе пра магчымасць некаторага павелічэння колькасці работнікаў пасольстваў, у першую чаргу консульскіх работнікаў. «Гэта пытанне знаходзіцца ў стадыі разгляду». Многіх цікавіць, ці можна чакаць візавых паслабленняў, асабліва для прадстаўнікоў бізнесу. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ў гэтым пытанні ёсць пэўныя праблемы, якія неабходна вырашаць сумесна з адміністрацыяй у ЗША. Ён распавёў, што падчас яго візіту ў Нью-Ёрк запланаваны ў тым ліку сустрэчы з прадстаўнікамі Дзярждэпартамента ЗША.

## НАМ — СІСТЭМЫ ВОДААЧЫСТКІ, ІМ — ТРАКТАРЫ?

Сусветна вядомая кампанія Culligan ужо рэалізавала шмат праектаў у нашай краіне. Сістэмамі водаачысткі і водападрыхтоўкі, якія выпускае прадпрыемства, абсталяваны шэраг буйных малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў. Яны таксама выкарыстоўваюцца ў тэхналогіі залівання лёду на спартыўных арэнах. Цяпер рэалізуюцца праекты на водазаборах у Мінску. Кіраўніцтва Culligan прыняло рашэнне значна пашырыць сваю вытворчасць у Беларусі і стварыць кампанію «Каліган Еўразія». Фактычна яна стане трэцім найбуйнейшым заводам кампаніі ў свеце, прадукцыя якога будзе арыентавана на ўсю еўразійскую прастору. Сёння вытворчыя лініі Culligan існуюць толькі ў ЗША і Італіі.

Міхаіл Мясніковіч таксама правёў яшчэ шэраг сустрэч з прадстаўнікамі амерыканскага бізнесу. У прыватнасці, абмеркаваны стан і перспектывы супрацоўніцтва з канцэрнам «Джэнерал Мотарс».

У сваю чаргу, Беларусь можа нарасціць пастаўкі трактароў на амерыканскі рынак. Віцэ-прэзідэнт кампаніі MTZ Equipment Ltd. Ар'е Прылік сказаў: «У часы СССР на паўночнаамерыканскім рынку прадавалася каля 4 тысяч беларускіх трактароў у год. Мы верым, што зможам вярнуцца на гэты рынак. Сёлета мы прададзім каля 100 трактароў і будзем паступова нарошчваць аб'ёмы», — сказаў прадстаўнік кампаніі. Па яго словах, беларускія трактары больш надзейныя і простыя ў эксплуатацыі, а іх рамонтапрыдатнасць лепшая.

***

Нагадаем, што беларуская дэлегацыя на чале з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам прыляцела ў Нью-Ёрк для ўдзелу не толькі ў інвестыцыйным форуме, але і ў Саміце па клімаце, які пачаўся ўчора. Больш падрабязна пра гэтую падзею «Звязда» раскажа ў найбліжэйшых нумарах.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Самыя-самыя

# ЛЕПШАМУ НАСТАЎНІКУ — ПРЫЗ ВУЧНЁЎСКІХ СІМПАТЫЙ

**Настаўнік — унікальная прафесія, якая патрабуе ад яе ўладальніка мэтанакіраванасці і самаадданасці, незвычайнай душэўнай шчодрасці, павагі і, самае галоўнае, любові да сваіх вучняў. Прафесія, якая заслугоўвае ўсенароднай павагі! Менавіта гэта давядзецца даказаць удзельнікам фіналу рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года», які адкрыўся ўрачыста ў сценах Ліцэя БДУ.**

З улікам таго, што ў адборачных турах па ўсёй краіне ўзялі ўдзел больш як 30 тысяч чалавек (а гэта, між іншым, утрая больш, чым раней), нават цяжка сабе ўявіць, наколькі высокае прафесійнае майстэрства будзе прадэманстравана ў фінале і наколькі вострай будзе канкурэнцыя сярод лепшых. А ў тым, што абсалютна ўсе педагогі, якія трапілі ў фінальную частку конкурсу, — вельмі цікавыя і неардынарныя асобы, сумнявацца не даводзіцца. Яны ўжо ведаюць смак перамогі, бо перамаглі спачатку на ўзроўні сваёй школы, затым на ўзроўні раёна і, нарэшце, вобласці. Або з'яўляюцца пераможцамі аднайменнага сталічнага конкурсу.

Высвятляць, хто з іх варты насіць ганаровае званне «Настаўнік года», будуць 49 педагогаў. Адметнасцю апошняга конкурсу стала ўвядзенне сямі прадметных намінацый. У кожнай з гэтых намінацый будуць вызначаны пераможца і два лаўрэаты. Але толькі пераможцы ў кожнай з намінацый трапяць у суперфінал. Менавіта з гэтай «сямёркі» шчасліўцаў і будзе выбірацца «Настаўнік года».

Як расказаў на сустрэчы з журналістамі **намеснік міністра адукацыі Васіль БУДКЕВІЧ**, педагагічны стаж фіналістаў вагаецца ад 2 да 30 гадоў. Самаму маладому фіналісту 26 гадоў, а самаму «даросламу» — 50. 29 фіналістаў з'яўляюцца ўладальнікамі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, 14 чалавек маюць першую катэгорыю і 5 — другую. Ёсць сярод прэтэндэнтаў на перамогу таксама і адзін уладальнік самай вышэйшай катэгорыі «настаўнік-метадыст».

У заключным этапе рэспубліканскага конкурсу ўдзельнічаюць шэсць настаўнікаў гісторыі, чатыры настаўнікі беларускай мовы, па тры настаўнікі фізікі і рускай мовы, па два настаўнікі матэматыкі, інфарматыкі і выяўленчага мастацтва, адзін настаўнік музыкі, тры настаўнікі фізічнай культуры, адзін настаўнік працоўнага навучання і гэтак далей. Безумоўна, правядзенне адборачных тураў конкурсу ў сямі намінацыях паспрыяла таму, што ў фінале прадстаўлена практычна ўся палітра школьных «прадметнікаў».

Ёсць сярод фіналістаў і пяць прадстаўнікоў сельскіх школ.

Журы рэспубліканскага конкурсу ўзначальвае **рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, доктар педагагічных навук, прафесар Аляксандр ЖУК**.

— Кампетэнтнасць, справядлівасць і добразычлівасць — менавіта гэтымі крытэрыямі будзе кіравацца журы ў сваёй рабоце, — паабяцаў Аляксандр Жук. — У складзе журы 17 дактароў і кандыдатаў педагагічных навук, 15 настаўнікаў, вядомых сваімі дыдактычнымі і метадычнымі знаходкамі, а таксама метадысты рэспубліканскага ўзроўню...

Яшчэ адна адметнасць сёлетняга конкурсу — работа вучнёўскага журы, у якое ўвайшлі вучні 10-х і 11-х класаў. Школьнікі выберуць свайго пераможцу і ўручаць яму прыз вучнёўскіх сімпатый. Напэўна, яно і правільна, бо ў дзяцей — сваё бачанне сучаснага педагога і свае куміры, таму паглядзець на працу настаўніка вачамі дзяцей нават прафесіяналам будзе карысна.

А імя ўладальніка галоўнага прыза конкурсу — «Хрустальнага жураўля» стане вядома беларускай грамадскасці ўжо 27 верасня.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# ЦЫГАРЭТА СЯБРУЕ З ТРАГЕДЫЯЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Чалавека можна прымусіць не курыць у грамадскім месцы, а не браць цыгарэту ў зубы дома — немагчыма. Ці існуе выйсце з гэтай сітуацыі?**

— Нашы геаграфічныя суседзі колькі гадоў таму прынялі еўрапейскія нормы, якія рэгламентуюць вытворчасць і рэалізацыю цыгарэт з нізкай магчымасцю ўзгарання. Што яны з сябе ўяўляюць? Гэта звычайныя цыгарэты, але спецыяльная фільтраваная папера мае некалькі негаручых кольцаў. Калі курыльшчык не зацягваецца, цыгарэта тлее да кальца і пасля згасае. Гэтым шляхам збіраемся пайсці і мы. Па нашай ініцыятыве ўнеслі змены ў міждзяржаўны стандарт. У класіфікацыю тытунёвых вырабаў уключылі такое паняцце, як «цыгарэты з нізкай магчымасцю ўзгарання». Летась у стандарт уключылі патрабаванні да выпрабавання падобных цыгарэт. Ужо выраблена выпрабавальная ўстаноўка, якая знаходзіцца зараз на тытунёвай фабрыцы ў Гродне.



**— І калі іх пачнуць выпрабляць?**

— Трэба яшчэ гэтыя патрабаванні ўключыць у тэхнічны рэгламент Мытнага саюза. Прапановы ўжо ўнеслі. Чакаем адказу. Між іншым, у вытворчасці такіх цыгарэт неабавязкова цалкам паўтараць досвед Заходняй Еўропы. Замест негаручых уставак можна выкарыстоўваць іншыя элементы. Напрыклад, раней, калі вы памятаеце, у Саюзе былі цыгарэты «Астра», якія ўмоўна можна было аднесці да цыгарэт з нізкай магчымасцю ўзгарання. Бо іх папера, калі чалавек не зацягваўся, проста тухла. У любым выпадку падобны крок знізіў бы колькасць пажараў.

Дарэчы, з 2002 года мы пачалі абсталёўваць жыллё добра вядомымі ўсім аўтаномнымі пажарнымі апавяшчальнікамі. Гэты даволі просты ў прымяненні сродак каштуе каля 100 тысяч рублёў. Падобная ўстаноўка зніжае рызыку гібелі чалавека ў выпадку пажару на 80 працэнтаў.

Варта адзначыць, што вялікую ролю ў трагічных выпадках на пажары адыгрывае чалавечы фактар. Таму вельмі важна не толькі ўсталяваць апавяшчальнік, пачаць выпускаць цыгарэту з нізкай магчымасцю ўзгарання, а яшчэ вучыць чалавека правілам бяспекі, пачынаючы з дзіцячага садка, школы. Між іншым, разам з МУС мы прапанавалі Міністэрству адукацыі зрабіць прадмет «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» абавязковым у навучальнай праграме беларускіх школ. На нашу думку, гэта будзе спрыяць павышэнню ведаў, навыкаў для таго, каб можна было папярэдзіць надзвычайную сітуацыю ці мінімалізаваць яе наступствы. Спадзяёмся, наша прапанова ўсё ж такі будзе падтрымана Міністэрствам адукацыі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Супраць наркотыкаў

# ПАГІБЕЛЬНАЯ «ЛЁГКАСЦЬ» БЫЦЦЯ

## У чым небяспека курыльных сумесяў?




**Спайс (ад англ. «spice» — спецыя, прыправа) — гэта травяная сумесь, у састаў якой уваходзяць не толькі звычайныя травы, але і сінтэтычныя рэчывы (або сінтэтычны канабіс). Сінтэтычныя рэчывы ў шмат разоў больш шкодныя за натуральныя кампаненты марыхуаны (гэта, вядома, не азначае, што апошняя з'яўляецца ідэальным варыянтам для ўжывання). Сутнасць у тым, што мізэрнай колькасці «сінтэтыкі» можа быць дастаткова для таго, каб пазбавіць чалавека жыцця. Немагчыма прадбачыць, якім чынам паўплывае ўжыванне таго ці іншага рэчыва на галаўны мозг канкрэтнага чалавека. Тым больш хімічныя формулы вытворцы мяняюць на раз-два.**

— Кожны арганізм індывідуальны, і калі адзін курыў сумесь пяць-шэсць разоў і пакуль не меў нейкіх заўважных наступстваў для арганізма і здароўя, гэта не азначае, што ў другога першае ж курэнне не скончыцца трагедыяй, — удакладняе **псіхолаг Цэнтра дружалюбнага стаўлення да падлеткаў «Поспех» Кацярына БЛІЗНЮК**. — Калі мы кажам пра ўздзеянне дыму сумесяў на арганізм, то тут варта мець на ўвазе тры тыпы небяспекі.

**1. Мясцовая рэакцыя.** Церпяць непасрэдна слізістыя абалонкі — узнікаюць хранічныя запаленчыя працэсы ў дыхальных шляхах (фарынгіт, ларынгіт, бранхіт). Курэнне міксаў выклікае кашаль, слёзацячэнне, асіпласць горла — падчас і пасля курэння. Ёсць высокая верагоднасць узнікнення злаякасных пухлін ротавай поласці, глоткі, гартані і бронхаў.

**2. Цэнтральная рэакцыя.** Самыя дробныя сасуды галаўнога мозга (капіляры) спрабуюць не дапусціць яд да «асноўнага цэнтра кіравання» і рэзка звужаюцца. Кроў у выніку не можа забяспечыць мозг кіслародам. Як і любыя клеткі, калі іх пазбавіць кіслароду, клеткі мозга гінуць. Менавіта гэты эфект і падабаецца чалавеку — узнікае адчуванне лёгкасці і бесклапотнасці.

Наогул рэакцыі ў курцоў могуць быць рознымі: эйфарыя, смех, плач, немагчымасць засяродзіць увагу і арыентавацца ў наваколлі, галюцынацыі, страта кантролю. Усе гэтыя рэакцыі пагражаюць не проста здароўю — жыццю чалавека. Адсюль і выхад на вуліцу праз вокны, і шэраг іншых зарэгістраваных статыстыкай выпадкаў гібелі маладых людзей.

Сістэматычнае курэнне міксаў прыводзіць да незваротных дэструктыўных працэсаў у цэнтральнай нервовай сістэме. Зніжаецца ўвага, пагаршаецца памяць, запавольваецца разумовая дзейнасць, з'яўляецца схільнасць да дэпрэсіі. Большасць курыльных сумесяў выклікае наркатычную залежнасць, прыводзіць да цяжкай інваліднасці па псіхічным захворванні.

**3. Таксічная рэакцыя.** Моцнадзейныя рэчывы, якія паступаюць разам з дымам, выклікаюць непрадказальны таксічны эфект. Курцы спайсу скардзяцца на ваніты, млосць, пачашчанае сэрцабіццё, сутаргі мышцаў. Магчымая страта прытомнасці і нават кома. З такімі сімптомамі і станамі аматары сумесяў і паступаюць у бальніцу.

## КУРЫЛЬНЫЯ СУМЕСІ ЗАБАРОНЕНЫ ЦАЛКАМ

Увядзенне ў заканадаўства паняцця «аналаг наркатычных рэчываў і псіхатропаў» дазволіла забараніць свабоднае абарачэнне рэчываў сінтэтычнага або натуральнага паходжання, хімічная структура і вартасці якіх падобныя на хімічную структуру і вартасці наркатычных рэчываў і псіхатропаў.

**Курцы спайсу скардзяцца на ваніты, млосць, пачашчанае сэрцабіццё, сутаргі мышцаў. Магчымая страта прытомнасці і нават кома. З такімі сімптомамі і станамі аматары сумесяў і паступаюць у бальніцу.**

Курыльныя сумесі «спайс» аднесены да асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў. За незаконнае абарачэнне (захоўванне і збыт) такіх рэчываў прадугледжана крымінальная адказнасць.

Незаконныя без мэты збыту выраб, перапрацоўка, набыццё, захоўванне, перавозка ці перасылка наркатычных рэчываў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсораў ці аналагаў караецца **абмежаваннем свабоды на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем свабоды на тэрмін ад двух да пяці гадоў.**

Незаконныя з мэтай збыту выраб, перапрацоўка, набыццё, захоўванне, перавозка ці перасылка або незаконны збыт наркатычных рэчываў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсораў ці аналагаў караецца **пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў з канфіскацыяй маёмасці ці без канфіскацыі.**

Дзеянні з мэтай збыту, учыненыя групай асоб або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або асобай, якая раней учыняла злачынствы, або ў дачыненні да наркатычных рэчываў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў у буйным памеры, або ў дачыненні да асабліва небяспечных наркатычных сродкаў ці псіхатропных рэчываў, або збыт наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў ці аналагаў на тэрыторыі ўстановы адукацыі, аховы здароўя, во-інскай часці, папраўчай установы, арыштнага дома, у месцах заключэння пад варту або ў месцы правядзення спартыўных, культурна-масавых ці іншых масавых мерапрыемстваў караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да трынаццаці гадоў з канфіскацыяй маёмасці ці без канфіскацыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

## БАЦЬКІ ПАВІННЫ ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ, КАЛІ ДЗІЦЯ...

- **пазбягае іх, часта і надоўга знікае з дому або замыкаецца ў сваім пакоі. Пытанні, зададзеныя нават самым далікатным чынам, выклікаюць успышку гневу;**
- змяніла кола кантактаў — старыя сябры зніклі, а новыя нічога не паведамляюць пра сябе і ўсяляк пазбягаюць увагі дарослых;
- **ператварае дом у «штаб-кватэру» — часта звоніць тэлефон, размовы па ім вядуцца выключна з дапамогай слэнгу (жаргонных і кодавых слоў, намёкаў);**
- знаходзіцца ў стане, падобным на ап'яненне, але паху алкаголю няма. Пры гэтым парушана каардынацыя рухаў, маўленне. Смяецца не да месца, зрэнкі пашыраны або звужаны;
- **не цікавіцца ні вучобай, ні сям'ёй, ні ранейшымі захапленнямі. Праяўляе раздражнёнасць, эгаізм, запальчывасць. Хлусіць;**
- то поўнае энергіі, вясёлае, то становіцца змрочным, пасіўным, кволым, плаксівым;
- **часта просіць грошы, і дакладна не зразумела, для чаго яны патрэбны. З дома знікаюць рэчы і грошы.**

Не ўпускайце жыццё сваіх дзяцей з-пад увагі. Калі вам стала вядома аб месцах збыту курыльных сумесяў, не цягніце — звяртайцеся ў міліцыю па месцы жыхарства.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НЕВЯЛІЧКІ, АЛЕ ВЕЛЬМІ ЎТУЛЬНЫ

**Падарункам да Дня горада Гомеля стаў новы дзіцячы садок №38.**



Маленькія жыхары 94-га і 96-га мікрараёнаў у Навабеліцкім раёне горада над Сожам пойдуць у яго з пачатку кастрычніка, расказала загадчыца ўстановы Вольга Аўчыннікава. На рэканструкцыю памяшкання са сродкаў гарадскога бюджэту было выдаткавана больш за 4,5 млрд рублёў. Новы спартыўны інвентар установе на дзень нараджэння ўручылі прадстаўнікі абласной выканаўчай улады.

Дзіцячы сад адпавядае ўсім нормам, стандартам і патрабаванням. Ён зможа змясціць каля 100 выхаванцаў — гэта 4 групы розных дашкольных узростаў. У групах старанна, з дапамогай дызайнераў, прадумана размяшчэнне спецыяльнай дзіцячай мэблі, якая не мае вострых вуглоў, гульнявога абсталявання, месцаў для творчасці. У гаспадарчых памяшканнях пастаўлены бойлеры — каб ніколі не мецъ перабояў з гарачай вадой. Пакойчыкі з прыгожымі дзіцячымі ложкамі, музычная зала, самае сучаснае абсталяванне ў блоку для харчавання, адпаведнае санітарным нормам, павінны стварыць добры настрой у дзяцей, выхавальнікаў і бацькоў. Тут не забылі і пра бяспеку. Ва ўстанову цяпер могуць трапіць толькі тыя, хто мае адпаведны чып-ключ. У самы бліжэйшы час плануецца ўсталяванне сістэмы відэаназірання. Да таго ж набыты дапаможнікі ў адпаведнасці з праграмай дашкольнай адукацыі.

Між тым выхавальнікі лічаць, што саміх дзяцей асабліва парадуе так званае развіваючае асяроддзе. За садком створана новая пляцоўка для гульняў з усімі неабходнымі складнікамі: пясочніцамі, лаўкамі, незвычайнымі клумбамі, якія нагадваюць казачных герояў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

## БОЛЬШ, ЧЫМ КНІГІ

**Аматары чытання зладзілі праект у дапамогу дзецям.**

Сустрэцца з вядомымі, таленавітымі ў розных сферах асобамі, прыемна правесці час і разам з тым дапамагчы камусьці, хто мае ў гэтым патрэбу? Рэалізаваць усё пералічанае адначасова могуць удзельнікі новага дабрачыннага літаратурнага праекта «Чалавек чытае». Яго ладзяць у сталіцы міжнародны дабрачынны фонд дапамогі дзецям «Шанс», інтэрнэт-крама «Куфэрак дзіцячых кніг» і літаратурны клуб «Куфэрак».

«Чалавек чытае» — гэта шэсць сустрэч-дыялогаў з вядомымі гасцямі пра любімыя і нелюбімыя кнігі, іх ролю ў жыцці і кар'еры, важнасць чытання наогул. «Сустрэчы будуць адбывацца ў сталічных кавярнях з перыядычнасцю раз на два тыдні, а ўваходным білетам на кожную з іх служыць квіток аб пераліку сродкаў на дабрачынны рахунак фонду дапамогі дзецям «Шанс», — расказвае адна з арганізатараў праекта Таццяна Пузырэвіч.

23 верасня падчас старту праекта пра ўсё гэта распавяла пісьменніца, сцэнарыст, тэле- і радыёвядучая Тамара Лісіцкая. На чарзе — сустрэчы з мастачкай Нікай Сандрас, гімнасткай Мелітай Станютай, заснавальніцай гастранамічнага партала і кулінарнай школы Oede.by Аленай Высоцкай і іншымі.

Акрамя таго, у «Куфэрку дзіцячых кніг» пастаянна дзейнічае акцыя «Падвешаная кніга» (па аналогіі з італьянскай ідэяй «падвешанай кавы» — кожны наведнік кавярні можа аплаціць кубак кавы і пакінуць яго «да запатрабавання» ў падарунак таму, у каго не хапае грошай). Так, беларусы могуць набыць дзіцячыя кнігі і «падвесіць» іх для дзяцей, якія праходзяць лячэнне ў анкацэнтры ў Бараўлянах.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## «МАЛЮТКА» НАСКОЧЫЛА НА «КАЗАНКУ»

**У Пінску спецыялісты АСВОДа выратавалі на рацэ двух рыбакоў.**

На Піне прыкладна а палове восьмай вечара сутыкнуліся два маламерныя судны — лодкі «Малютка» і «Казанка». Балазе, гэтае «воднае ДТЗ» адбылося за 20 метраў ад выратавальнай станцыі і ў межах горада. У выніку два мужчыны з «Малюткі» аказаліся ў рацэ. Іх з вады дасталі работнікі АСВОДа. У другой лодцы знаходзіліся тры чалавекі, якія не пацярпелі. У абодвух маламерных суднах людзі знаходзіліся ў выратавальных камізэльках.

## ЛЁГ У КАЛЯІНУ І ЗАГІНУЎ

**Хлопец лёг у чыгуначную каляіну і загінуў пад коламі электрацягніка Мінск — Асіповічы.**

Як паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, здарэнне адбылося на перагоне Калядзічы — Міханавічы. Малады чалавек ляжаў у каляіне і не рэагаваў на сігналы электрычкі. У выніку ён атрымаў смяротныя траўмы.

Яшчэ адзін інцыдэнт на чыгунцы адбыўся з дызель-цягніком Друя — Круляўшчызна, які наехаў на цялят, што аказаліся на пуці. Хаця рэзка затармазіў састаў, але сутыкнення пазбегнуць не ўдалося. Затрымка руху склала гадзіну.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СПРАВА — ЗА ПЕРАМОГАМІ!

**У Партызанскім раёне Мінска адкрылася зала бокса.**


Чэмпіён свету па боксе сярод студэнтаў Сяргей КАРНЕЕЎ.

Новая спартыўная зала адкрылася ў будынку прафесійна-тэхнічнага каледжа на вуліцы Ваўпшасава. У ім будуць займацца баксёры-пачаткоўцы, а таксама тыя, хто трэніруецца ўжо некалькі гадоў. У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця залы прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, адміністрацыі Партызанскага раёна, Беларускай федэрацыі бокса, рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў, тытулаваныя спартсмены і трэнеры.

Як адзначыў галоўны трэнер зборнай Беларусі па боксе Канстанцін Сакалоў, у зале ёсць усё для паўнавартасных трэніровак. Настаўнік пажадаў юным спартсменам поспехаў у вучобе і спорце і ўручыў некалькі пакетаў, даверху забітых пальчаткамі. Ён таксама паабяцаў, што Беларуская федэрацыя бокса прывязе пры неабходнасці яшчэ экіпіроўку.

**Аляксандр ШАБЛЮК, фота аўтара.**


Паказальныя баі з удзелам юных спартсменаў школы алімпійскага рэзерву.

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 8 (37)

■ Тонкасці прафесіі

# Усё вырашаць... КАРТЫ,

## або Наколькі патрэбны сёння ваенныя тапографы і картографы?

**У свой час Пётр І, ствараючы корпус ваенных тапографаў, прапісаў у статуце, што ваеннымі тапографамі могуць быць толькі афіцэры дваранскага саслоўя. І невыпадкова: са стварэннем картаў, інжынерна-тэхнічнымі даследаваннямі мясцовасці маглі справіцца толькі адукаваныя асобы. Сучасныя тапографы і картографы не саступаюць сваім папярэднікам. Вядома, класавая прыналежнасць спецыялістаў сёння не адыграе ролі, але тым не менш, як правіла, гэта людзі з вышэйшай адукацыяй, высокакваліфікаваныя прафесіяналы, якія валодаюць глыбокімі ведамі аб усіх фізічных працэсах, што адбываюцца на зямлі.**

Менавіта такія і працуюць у 31-м навігацыйна-тапаграфічным цэнтры Узброеных Сіл нашай краіны. Ваенныя тапографы, картографы і геадэзісты — пераемнікі 2-га матарызаванага тапаграфічнага атрада, які быў сфарміраваны ў красавіку 1933 года ў Смаленску. Сёння гэта ўнікальная вайсковая часць, якая складаецца з некалькіх падраздзяленняў. У кожнага з іх — свая спецыфіка. Даведацца якая, пашчасціла якраз падчас тактыка-спецыяльных вучэнняў — перыяду праверкі магчымасцяў цэнтра практычна выканаць задачы па прызначэнні. У час, калі ўсе карты адкрыты — вядома, за выключэннем тых, якія змяшчаюць сакрэтную інфармацыю. А ў прамым сэнсе — тады, калі ўсё максімальна прыбліжана да баявога становішча.



Падчас правядзення геадэзічных работ.

### Даследчыкі беларускага рэльефу

У навігацыйна-геадэзічнай часці цэнтра людзей не густа. Працу, вядома, ніхто не прагульвае: спецыялісты ў полі — даследуюць мясцовасць. Аб'ездзілі ўсю Беларусь. Няма такога кавалка зямлі, на які б не мелася свая карта. На адной і той жа мясцовасці спецыялістам даводзіцца бываць неаднойчы. А ўсё таму, што, як казаў Геракліт, усё цячэ, усё змяняецца. Некалькі гадоў таму тут была вялікая вёска, а зараз — усяго некалькі хат. Ці на гэтым месцы раней расло дрэва, а цяпер яго няма. Праклалі дарогу, вырубілі лес, выкапалі возера — усе змены фіксуюць ваенныя тапографы і геадэзісты.

— Любыя новыя звесткі вельмі важныя для нас, — расказвае **начальнік навігацыйна-інфармацыйнага аддзялення Леанід КОР'ЕЎ.** — Па прыездзе ў цэнтр абнаўляем тапаграфічныя карты, сістэматызуем і апрацоўваем атрыманую палявым метадам інфармацыю, як і тую, што зафіксавалі касмічныя апараты навігацыйных сістэм.

Бывае, што адначасова (праўда, на розных аб'ектах) працуе не адна каманда геадэзістаў і тапографаў. Іх называюць разлікамі — афіцэр і тры салдаты тэрміновай службы. Сярод апошніх, дарэчы, выпадковых людзей няма. Ва ўзвод тапаграфічнага забеспячэння прызываюцца юнакі з добрым веданнем матэматыкі і фізікі. Неаднойчы траплялiся прызыўнікі з вышэйшай адукацыяй, нават са спецыяльнай. Тыя, у каго яе няма, праходзяць курс маладога байца, засвойваюць тактыка-спецыяльную падрыхтоўку, вучацца валодаць прыборамі — і ў поле.

На той момант, калі намеснік начальніка тапагеадэзічнага аддзялення Сяргей Дзятлаў вырашыў звязаць свой лёс з тапаграфіяй і картаграфіяй, у Беларусі такіх спецыялістаў не рыхтавалі. Прафесію атрымліваў у Санкт-Пецярбургскім ваенна-тапаграфічным інстытуце (цяпер Ваенна-касмічная акадэмія імя Мажайскага). Па спецыяльнасці Сяргей — картограф. У навігацыйна-геадэзічнай часці павышае сваю кваліфікацыю: хоча быць асам у сваёй справе.

**Стварэнне картаў — вельмі карпатлівая праца, з якой могуць справіцца толькі жанчыны. У гэтай справе неабходны ўседлівасць і ўважлівасць.**

Своеасаблівая праверка ваенных геадэзістаў і тапографаў на прафпрыдатнасць — вучэнні. Ніводнае вучэнне не адбудзецца без іх папярэдняй працы. Танк не паедзе па мясцовасці, пакуль экіпаж не будзе валодаць яе характарыстыкамі. Ніякая іншая тэхніка без звестак аб грузападымальнасці не рызыкне пераадолець пэўны мост.

— Зараз актыўна развіваюцца аўтаматызаваныя сістэмы кіравання, усё пераводзіцца на сродкі вылічальнай тэхнікі, — гаворыць **начальнік навігацыйна-тапаграфічнай службы Узброеных Сіл — начальнік навігацыйна-тапаграфічнага ўпраўлення Генеральнага штаба палкоўнік Дзмітрый ЛУК'ЯНЕНКА.** — Але як бы далёка ні крочыў наперад тэхнічны прагрэс, без папяровай карты ўсё роўна войскі ў бой не пойдуць. У той жа час, калі раней мы выконвалі работы звычайнымі геадэзічнымі прыборамі і інструментамі, то цяпер пераходзім на спадарожнікавыя тэхналогіі: развіваецца амерыканская сістэма GPS, укараняецца расійская GLONAS. Гэта ўсё дазваляе ў разы скараціць час на выкананне задач. Тое, што раней рабілі дзень-два, цяпер займае ўсяго некалькі гадзін. Прычым дакладнасць застаецца такой жа высокай.

**Своеасаблівая праверка ваенных геадэзістаў і тапографаў на прафпрыдатнасць — вучэнні. Ніводнае вучэнне не адбудзецца без іх папярэдняй працы.**



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

Тапограф з 55-гадовым стажам Леанід ЛУК'ЯНЕНКА вывучае аэрафотаздымак.

### Справа жаночых рук — і цярпення

Пасля таго, як тапографы і геадэзісты апрацавалі атрыманыя звесткі, яны трапляюць у часць стварэння лічбавай інфармацыі аб мясцовасці. Тут уладараць спецыялісты па геаінфармацыйных сістэмах.

— На аснове картаграфічнага матэрыялу — а гэта, часцей за ўсё, фотадакументы мясцовасці, старыя тапаграфічныя карты, даныя геадэзічных вымярэнняў — мы ствараем электронныя карты мясцовасці, — уводзіць у курс справы **намеснік начальніка 1-га аддзялення стварэння электронных картаў старшы лейтэнант Міхаіл ЗАПРУЦКІ.** — Гэтыя карты прызначаны не толькі для ваенных: імі могуць карыстацца прадстаўнікі і іншых сфер дзейнасці. Вядома, у выніку пэўнай дамоўленасці. У межах сістэмы ўзаемаабмену наш цэнтр узаемадзейнічае з многімі грамадскімі арганізацыямі, у тым ліку з «Белгеадэзіяй».

Цікава, што ў часці стварэння лічбавай інфармацыі аб мясцовасці большасць спецыялістаў складае грамадзянскі персанал. Сярод іх — амаль усе жанчыны, у тым ліку і кіраўніца. Як прызнаецца **начальнік часці падпалкоўнік Людміла БУДНІК,** стварэнне картаў — вельмі карпатлівая праца, з якой могуць справіцца толькі жанчыны. «У гэтай справе неабходны ўседлівасць і ўважлівасць. Як правіла, нашы моцныя мужчыны гэтай манатоннай працы не вытрымліваюць».

Людміла Буднік у навігацыйна-тапаграфічным цэнтры — старажыл. Высокай пасадзе папярэднічалі доўгія 16 гадоў плённай працы. А пачынала грамадзянскім інжынерам у картаскладальніцкім аддзяленні.

Лоты №№ 6–11 выставляются на аукцион повторно. Извещения были опубликованы в газете «Звязда» 16.08.2014 г.

**Контактные телефоны: 77-69-35; 77-67-27; факс: 77-48-85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by**

**Считать недействительными страховые полисы и квитанции ЗАО «СК «Белросстрах»:**

- добровольное страхование от несчастных случае и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1220296, 1177697, 1268757, 1331090, 1331091, 1359703, 1093963;

- добровольное страхование от несчастных случаев (2РН, 2РП) серия НС № 0024865;

- квитанция 1 СУ серия КС №№ 4294366, 4282050-4282051, 4283579.

УНП 100782388

# ВНИМАНИЕ АУКЦИОН

## по продаже незавершенного строительством многоквартирного жилого дома в г. Молодечно ОАО «Кричевцементношифер» (Филиал «Завод ЖБК» г. Молодечно ОАО «Кричевцементношифер»)

| |
|---|
| **Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение, расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Машерова, 1 (инвентарный номер ЕГРНИ 630/U-72460, назначение по проекту – многоквартирный жилой дом, далее – объект).** |
| Характеристика объекта: площадь 526 кв.м, планируемое здание разноэтажное, будет состоять из одной секции в семь и девять этажей и приблокированной секцией в пять этажей, строительная готовность 14% (фундамент – бетонный ленточный). |
| Площадь земельного участка 0,2920 га, кадастровый номер 623850100003002617 предоставлен в постоянное пользование, целевое назначение – земельный участок для строительства многоквартирного жилого дома со встроенной аптекой, автомобильной парковкой, детской площадкой. |
| Объект продается без условий. |
| Начальная цена продажи **4 484 800 000** (Четыре миллиарда четыреста восемьдесят четыре миллиона восемьсот тысяч) рублей (без НДС). **Начальная цена продажи снижена на 20%.** |
| Сумма задатка **224 240 000** (Двести двадцать четыре миллиона двести сорок тысяч) рублей (без НДС). |

**Аукцион состоится <u>7 октября 2014 г. в 15.00</u> по адресу: г. Молодечно, ул. Рабочая, 5, актовый зал.**

Продавец объекта – ОАО «Кричевцементношифер» (Филиал «Завод ЖБК» г. Молодечно ОАО «Кричевцементношифер»).

Организатор аукциона – ООО «БелИнвестОценка».

К участию в торгах допускаются юридические и физические, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и иные документы.

Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № 3012150544012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

**Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 06.10.2014 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 416 (здание ГО «Белресурсы»). Заключительная регистрация участников 07.10.2014 с 14.00 до 14.45 по месту проведения аукциона.**

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Кричевцементношифер» не позднее 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 17.00.

Контактный телефон продавца в г. Молодечно: 8 029 863 50 94 (МТС).

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-28-50, 398-29-44, 8 (029) 142 33 07; e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by.

Извещение о продаже объекта опубликовано в газете «Звязда» 19.08.2014 № 155 (27765).

Краіна здароўя

Выпуск
№ 15 (326)

■ Сезонная парада

# КАМУ ПРЫШЧЭПКУ?

**Да лістапада будзе доўжыцца імунізацыя ад грыпу. Для бясплатнай вакцынацыі выкарыстоўваецца вакцына «Флюваксін» (Кітай). Для тых, хто жадае прышчапіцца за ўласны кошт, прапануецца не толькі «Флюваксін» (79 000 руб.), але «Ваксігрып» (Францыя, 113 500 руб.) і «Грыпол» (Расія, 87 350 руб.). Крыху пазней з'явіцца «Інфлювак» (Нідэрланды), паведамляюць у 11-й гарадской паліклініцы г. Мінска.**

## Па паказаннях (бясплатна) вакцынацыя ад грыпу праводзіцца пацыентам:

- **ва ўзросце пасля 65 гадоў,**
- **з хранічнымі захворваннямі,**
- **з імунадэфіцытам,**
- **нізкай вагой,**
- **цяжарным,**
- **дзецям да 1 года.**

Да групы высокай рызыкі інфіцыравання адносяцца таксама школьнікі і навучэнцы, медперсанал, работнікі транспарту і галіны абслугоўвання. Не варта недаацэньваць небяспеку і ў воінскіх падраздзяленнях, казармах, дзе ствараюцца аптымальныя ўмовы для перадачы ўзбуджальніка.

Пытанне спецыфічнай абароны ад грыпу застаецца актуальным недарэмна. Вядома звыш 2 тысяч варыянтаў віруса грыпу, які славіцца высокай рызыкай развіцця ўскладненняў і лятальных зыходаў.

## Прафілактыка грыпу бывае...

- **спецыфічная (прышчэпка),**
- **неспецыфічная (правілы паводзін і асабістай гігіены),**
- **хімічная (павышэнне імунітэту з дапамогай супрацьвірусных прэпаратаў).**

— Вакцынацыя з'яўляецца навукова абгрунтаваным, эканамічна мэтазгодным, сацыяльна апраўданым сродкам барацьбы супраць грыпу, — кажа **ўчастковы тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна СКАРАХОД**. — Правядзенне штогадовых вакцынацый супраць сезоннага грыпу значна зніжаюць захваральнасць і смяротнасць ва ўсіх узроставых групах. Для лепшага эфекту прафілактыку неабходна праводзіць да наступлення сезоннага піку захваральнасці. Імунітэт пасля правядзення вакцынацыі трымаецца да 6 месяцаў, пасля чаго пачынае зніжацца.

Супрацьгрыпозныя вакцыны выкарыстоўваюцца больш за 60 гадоў і даказалі сваю эфектыўнасць. Пабочныя эфекты сустракаюцца даволі рэдка і, як правіла, гэта грыпападобныя сімптомы (галаўны боль, ламота ў целе, слабасць, нязначная тэмпература, пачырваненне скуры ў месцы ўколу), што немагчыма параўнаць з працяканнем самога грыпу. Алергічныя рэакцыі і сур'ёзныя пабочныя эфекты сустракаюцца вельмі рэдка і складаюць 1 выпадак на мільён прышчэпленых.

## Супрацьпаказанні да вакцынацыі:

- **алергічныя рэакцыі на кампаненты вакцыны (курыны бялок);**
- **алергічныя захворванні, рэакцыі на мінулую прышчэпку;**
- **абвастрэнне хранічных захворванняў або вострыя інфекцыйныя захворванні, якія суправаджаюцца высокай тэмпературай.**



Фота БЕЛТА.

Хіміяпрафілактыку неабходна выбіраць разам з урачом.

## Самастойна можна...

- **ужываць цыбулю і часнок,**
- **рабіць інгаляцыі з дапамогай мяты і сасны.**
- **гатаваць напоі з лімонам, шыпшынай, журавінамі, брусніцамі, абляпіхай.**

# З ПЕРШЫХ ДЗЁН ЖЫЦЦЯ...

**Здаровае немаўля заўсёды рэагуе на звароты да яго (на галасы, прыемныя мелодыі) — перастае плакаць, засяроджваецца на дарослым. Пастаянныя зносіны з дружалюбна настроенымі блізкімі стымулююць рэакцыі, прымушаюць разглядваць прадметы і засяроджвацца на твары таго, хто з малым размаўляе. Калі дзіця актыўна даследуе свет і кантактуе з навакольнымі, усе структуры мозга развіваюцца раўнамерна. Аднак калі падобнае імкненне адсутнічае, то шанцы на паспяховае развіццё вельмі малыя.**



У такім выпадку размова ідзе пра затрымку агульнага развіцця ўжо з першых месяцаў жыцця. Сям'я з такой праблемай павінна звярнуцца да спецыялістаў службы ранняга ўмяшання. **У Цэнтры ранняга ўмяшання, што адкрыўся на базе 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска чатыры гады таму, працуюць урач-неўролаг, лагапед, псіхолаг, інструктар лячэбнай фізкультуры і рэгістратар.** Наогул у сталіцы некалькі падобных цэнтраў, якія працуюць па прынцыпе тэрытарыяльнага дзялення. Дзяцей у іх могуць накіраваць спецыялісты паліклінікі, але можна звярнуцца і самастойна.

## Якія дзеці трапляюць у праграму ранняга ўмяшання?

**1. Дзеці да 3 гадоў, якія адстаюць у развіцці.**

**2. Дзеці, у якіх выяўлены парушэнні, што з высокай верагоднасцю прывядуць да адставання ў развіцці.**

Такіх парушэнняў даволі шмат: зніжэнне слыху, слепата, слабае бачанне ў выніку прыроджаных ці набытых захворванняў вачэй або траўмаў, цэрэбральныя і спінальныя паралічы, генетычныя сіндромы і храмасомныя парушэнні, прыроджаныя анамаліі развіцця, цяжкія паражэнні цэнтральнай нервовай сістэмы, злаякасныя формы эпілепсіі.

Калі ёсць цяжкасці ў кантакце з дзіцем, падазрэнне на ранні дзіцячы аўтызм, сур'ёзныя змяненні ў паводзінах з-за перажытага стрэсу.

Сюды адносяцца і дзеці біялагічнай групы рызыкі — неданошаныя, з масай цела менш за 1500 г. А таксама дзеці сацыяльнай групы рызыкі — бацькоў з псіхічнымі захворваннямі; бацькоў, якія пакутуюць ад алкагалізму ці наркаманіі; дзеці зусім маладых маці (да 16-17 гадоў); ахвяры гвалту.

— Наогул сям'я павінна быць паўнапраўным удзельнікам каманды спецыялістаў — як на этапе ацэнкі ўзроўню развіцця дзіцяці, так і падчас рэалізацыі індывідуальнай праграмы дапамогі, — кажа **ўрач-неўролаг Цэнтра ранняга ўмяшання 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Святлана МАЛАШЭВІЧ.** — Супрацоўнікі нашага цэнтра займаюцца развіццём дзіцяці ў праблемных галінах. Фізічны тэрапеўт праводзіць ацэнку рухальнага развіцця, навучае бацькоў прыёмам стымуляцыі самастойнай актыўнасці дзіцяці, стварэнню навакольнага асяроддзя, якое будзе стымуляваць дзіця да руху, падбірае абсталяванне, дапаможныя тэхнічныя сродкі. Педыятр ацэньвае ўзровень здароўя дзіцяці, кансультуе па пытаннях рэжыму дня, сну, кармлення, навучае бацькоў прыёмам догляду дзіцяці. Лагапед дапамагае ў развіцці камунікатыўных здольнасцяў дзіцяці, фарміраванню сродкаў зносін, асваенні альтэрнатыўных формаў камунікацыі (карцінкі, жэсты, сімвалы, піктаграмы). Псіхолаг ацэньвае цячэнне крызісных перыядаў, сацыяльна-эмацыянальнае, пазнавальнае развіццё, рэгулюе праблемы паводзін, працуе з парушэннямі ў дзіцяча-бацькоўскіх стасунках. Псіхолаг таксама спрыяе наладжванню ўнутрысямейнага ўзаемадзеяння. Дзецям з пастаўленымі медыцынскімі дыягназамі праводзіцца прафілактыка найбольш верагодных ускладненняў.

Але ніякія намаганні спецыялістаў не будуць эфектыўнымі, калі іх не падтрымлівае сям'я. Менавіта яна першай павінна прыняць, зразумець, палюбіць дзіця і дапамагчы яму.

■ Пасля адпачынку

# ДЭПРЭСІЯ АБО ПРЫЛІЎ СІЛ?

**Даследчы цэнтр «HeadHunter Беларусь» праекта работа.tut.by высветліў, з якім настроем беларусы вяртаюцца да сваіх працоўных абавязкаў пасля адпачынку. У лік апытаных трапілі 384 чалавекі. Кожны трэці з іх, як высветлілася, знаходзіцца ў прыгнечаным настроі, блізкім нават да дэпрэсіўнага.**

## З якім настроем вы звычайна вяртаецеся на працу пасля адпачынку?

**29,4% — добры настрой, нягледзячы ні на што**
**19,8% — нервовы, прыгнечаны настрой**
**18,8% — вяртаюся як нічога ніякага**
**18% — у мяне выдатны настрой, я поўны сіл**
**13,5% — у мяне сапраўдная дэпрэсія**
**0,5% — не ведаю**

«Каб прыйсці ў нармальны працоўны стан, людзям патрабуецца, як правіла, ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў, — каментуе **дырэктар «HeadHunter Беларусь» Святлана ШАПАРАВА.** — У рэдкіх выпадках патрабуецца каля месяца. Каб хутчэй увайсці ў працоўныя будні і справіцца з нервовым напружаннем, каля 40% рэспандэнтаў імкнуцца з першага дня з галавой акунуцца ў працу. 18% пачынаюць планаваць наступны адпачынак, 10% заводзяць новае хобі, астатнія ж або нічога не робяць, або імкнуцца першы час працаваць менш.

Чвэрць беларусаў лічаць сваю работу адразу пасля адпачынку менш эфектыўнай, чым звычайна. Але, як правіла, людзі прыходзяць з адпачынку з новымі сіламі, і амаль палова апытаных адзначае, што прадукцыйнасць іх працы павялічваецца, а часам і значна. Зараду энергіі і станоўчых эмоцый, атрыманых за час адпачынку, хапае на некалькі месяцаў, а некаму нават і да наступнага адпачынку.

■ Асабліва небяспечны

# ТУБЕРКУЛЁЗ: КАЛІ БАКТЭРЫЯ МАЦНЕЙШАЯ ЗА ЛЕКІ

**Туберкулёзнай бактэрыяй інфіцыравана большасць нашага насельніцтва. На шчасце, не ўсе інфіцыраваныя пачынаюць хварэць, але кожны з іх жыве з гэтым узбуджальнікам. А той можа «прачнуцца» ў любы момант. Сусветная арганізацыя аховы здароўя сцвярджае, што вельмі высокай рызыцы захворвання падвяргаюцца людзі з аслабленай імуннай сістэмай. Імунітэт, па вялікім рахунку, аслаблены ў мноства людзей, асабліва ў дзяцей і старых. А ў людзей з ВІЧ верагоднасць развіцця актыўнага туберкулёзу разоў у трыццаць вышэйшая, чым у неінфіцыраваных (летась туберкулёз быў выяўлены ў 301 чалавека з ВІЧ).**

Заявіць пра сябе туберкулёз можа неабавязкова ў лёгкіх, а фактычна ў любым органе і тканках — у гэтым яго моц і каварства. Самым жа распаўсюджаным застаецца першы варыянт. Ён жа і самы небяспечны з пункту гледжання магчымай эпідэміі.

З 2005 года ў краіне захоўваецца тэндэнцыя паляпшэння паказчыкаў захваральнасці — яна няўхільна зніжаецца. Дзіцячая, напрыклад, знізілася за некалькі гадоў у 3,5 раза. Так, за мінулы год зафіксавана ўсяго 39 выпадкаў захворвання на туберкулёз сярод дзяцей да 17 гадоў.

— Барацьба з гэтым значным, асабліва небяспечным захворваннем застаецца актуальнай для ўсяго свету, — кажа **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра пульманалогіі і фтызіятрыі Генадзь ГУРЭВІЧ.**

**Для Беларусі характэрна праблема множнай лекавай устойлівасці, пры якой бактэрыя-ўзбуджальнік туберкулёзу не вынішчаецца асноўнымі лекавымі прэпаратамі.**

Для Еўропы наша краіна ў гэтым сэнсе застаецца ў ліку прыярытэтных. Таму што для Беларусі характэрна праблема множнай лекавай устойлівасці, пры якой бактэрыя-ўзбуджальнік туберкулёзу не вынішчаецца асноўнымі лекавымі прэпаратамі. Апошнія яшчэ называюць прэпаратамі «першага шэрагу». Ёсць яшчэ лекі «другога шэрагу», аднак і да іх многія пацыенты застаюцца неадчувальнымі. Гэтая з'ява называецца ўжо шырокай лекавай устойлівасцю.

На сёння 30 працэнтаў упершыню выяўленых пацыентаў маюць множную лекавую ўстойлівасць, а сярод паўторна пралечаных такое назіраецца ў 70 працэнтаў. Зразумела, мы лечым такіх пацыентаў, аднак гэта вельмі няпроста. Па-першае, таму, што лячэнне ў такім выпадку цягнецца не паўгода, як звычайна, а два гады. Выкарыстоўваюцца пры гэтым больш дарагія прэпараты, якія валодаюць больш выяўленым пабочным эфектам. У такой сітуацыі цяжка матываваць пацыентаў на тое, каб яны завяршылі лячэнне. Асабліва калі ўлічыць, што нярэдка на туберкулёз хварэюць прадстаўнікі так званых маргінальных слаёў грамадства, людзі без пэўнага месца жыхарства і да т.п. ад якіх складана дабіцца разумення. Усё ж такі пацыент знаходзіцца пад пільным наглядам медработніка толькі першыя паўгода, пасля чаго пераводзіцца на амбулаторны этап. Гэта азначае, што чалавек павінен рэгулярна прыязджаць у медустанову — у дыспансер, паліклініку і г.д. Пацыент, дарэчы, сам выбірае, як яму зручней атрымліваць прэпарат. Медустановы цалкам забяспечаны неабходнымі лекамі, аднак немагчыма прымусіць амбулаторных хворых з'явіцца, узяць, прыняць...

Сродкі на супрацьтуберкулёзныя мерапрыемствы выдаткоўваюцца як з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, так і з Глабальнага фонду па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. З 2008 года краіна атрымала з Глабальнага фонду каля 36 млн долараў. Дзякуючы апошняму гранту ў 2015 годзе будзе набыты новы прэпарат для хворых з множнай лекавай устойлівасцю. Наогул гэтыя грошы накіроўваюцца на самыя складаныя кірункі — закупку рэзервовых супрацьтуберкулёзных прэпаратаў, у тым ліку незарэгістраваных у Беларусі, а таксама на навучанне персаналу, аснашчэнне медработнікаў індывідуальнымі сродкамі абароны і інш.

У нас ёсць выдатныя магчымасці для дыягностыкі. Выявіць узбуджальнік туберкулёзу і нават вызначыць адчувальнасць да рыфампіцыну (прэпарату «першага шэрагу») можна цягам сутак, а не двух месяцаў, як гэта было некалі. Такія магчымасці дазваляюць зрабіць лячэнне больш эфектыўным. Вядома шэсць кампанентаў, важных для перамагання інфекцыі — наяўнасць прэпаратаў, эфектыўная схема лячэння, барацьба з пабочнымі з'явамі, правільная мадэль амбулаторнага лячэння (пацыент выбірае, куды будзе прыязджаць па лекі), матывацыя (забеспячэнне хворых праязнымі білетамі і прадуктовымі наборамі ў выпадку бесперапыннага ўжывання прэпаратаў), навучанне і матывацыя ўласна медработнікаў. У Магілёўскай вобласці зараз рэалізуецца пілотны праект, звязаны з павышэннем матывацыі медыцынскіх работнікаў, якія кантралююць лячэнне, шляхам матэрыяльнага заахвочвання ў выпадку дастаўкі лекаў на дом пацыенту. У канцы года даследуем, наколькі эфектыўным аказаўся такі падыход.

Наш цэнтр вывучае зараз і магчымасці прымянення сучасных метадаў для ўзмацнення эфектыўнасці лячэння выпадкаў множнай лекавай устойлівасці з дапамогай ствалавых клетак. Праведзена 30 трансплантацый. Аднак ацаніць вынікі можна будзе крыху пазней.

**❍ Множная лекавая ўстойлівасць узнікае, як правіла, з-за таго, што пацыенты самастойна перарываюць лячэнне, не захоўваюць, як кажуць спецыялісты, прыхільнасці яму. Мікроб становіцца неадчувальным да антыбіётыку. Адсюль і праблема — чым лячыць у наступны раз, пры аднаўленні лячэння?**

**❍ Паводле закона, па судовым рашэнні можна прымусіць чалавека да абследавання і лячэння.**

**❍ Пробы Манту могуць рабіць толькі ў групах рызыкі. Аднак нават калі такія спробы будуць рабіцца ўсім дзецям без разбору, у гэтым няма ніякай пагрозы іх здароўю. Для ўдакладнення дыягностыкі выкарыстоўваецца сёння і «Дыяскінтэст» з тым жа прынцыпам правядзення, што і проба Манту.**

■ Афтальмолаг рэкамендуе

# БЕЗ АКУЛЯРАЎ НЕ АБЫСЦІСЯ

**Вастрыня зроку залежыць ад таго, наколькі дакладна аптычныя выявы факусіруюцца на сятчатцы (унутранай абалонцы вочнага яблыка). Недасканаласць гэтага механізму называецца парушэннем рэфракцыі і вымяраецца ў дыяптрыях.**

— Рагавіца, хрусталік і шклопадобнае цела пераламляюць промні святла і накіроўваюць іх у пэўную кропку, — тлумачыць **урач-афтальмолаг 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Надзея ХАРОШКА.** — Калі гэта кропка знаходзіцца перад або за сятчаткай, тады выява недакладная. У першым выпадку гэта блізарукасць, або міяпія, у другім — дальназоркасць, або гіперметрапія. Да парушэнняў адносяцца яшчэ астыгматызм і прэсбіяпія.

**БЛІЗАРУКАСЦЬ (МІЯПІЯ).** Ад яе пакутуе кожны трэці чалавек. Гэтыя людзі дрэнна бачаць аддаленыя прадметы і добра — аб'екты, размешчаныя на блізкай адлегласці. **Да 18 гадоў** прычынамі яе развіцця з'яўляюцца хуткі фізіялагічны рост вочнага яблыка, інтэнсіўныя зрокавыя нагрузкі, зрокавая работа на блізкай адлегласці (школьная міяпія). Асноўнымі прычынамі **пасля 20 гадоў** могуць стаць перанесеныя захворванні вачэй і шкодныя ўмовы працы. Першыя прыкметы: прыжмурванне, нізкае нахіленне галавы, імкненне дзіцяці стаць бліжэй да тэлевізара. Пры рабоце на блізкай адлегласці можа ўзнікаць боль у вачах, галаўны боль. Калі блізарукасць не стабілізаваць, яна пераходзіць у міяпічную хваробу (міяпія высокай ступені — больш за 6 дыяптрый). Апошняя спрыяе адслаенню сятчаткі і глаўкоме (павышаны ўнутрывочны ціск). Вось чаму такімі важнымі ў дзіцячым узросце будуць наведванне афтальмолага 1-2 разы на год, прафілактычныя захады і карэкцыя пагаршэння зроку з дапамогай акуляраў і кантактных лінзаў.

**ДАЛЬНАЗОРКАСЦЬ (ГІПЕРМЕТРАПІЯ).** Гэта цяжкасці ўспрымання блізка размешчаных прадметаў. У **6-7 гадоў** дальназоркасць уласцівая ўсім дзецям і звязана з ростам вочнага яблыка. Пазней яна павінна знікнуць. Калі гэтага не адбываецца, то можна гаварыць аб захворванні. Дзеці з дальназоркасцю хутка стамляюцца, не ўмеюць засяроджвацца на заданнях, дрэнна вучацца, дрэнна спяць. У дарослых гіперметрапія праяўляецца хуткай зрокавай стамляльнасцю пры рабоце на блізкай адлегласці, дробны тэкст пачынае «расплывацца» і ўзнікае жаданне адсунуць ліст паперы для больш далёкага бачання. Ранняя дыягностыка, нашэнне акуляраў і кантактных лінзаў дазваляюць знізіць рызыку такіх ускладненняў, як «лянівае вока» і касавокасць.

**АСТЫГМАТЫЗМ.** Гэта асаблівы від аптычнай будовы вока. Пры астыгматызме выява скажаецца на сятчатцы з-за няроўнасцяў рагавіцы і хрусталіка. Астыгматызм праяўляецца паніжэннем зроку як на адлегласці, так і зблізку, зніжэннем працаздольнасці, хваравітымі адчуваннямі ў вачах пры рабоце на блізкай адлегласці. Паказаны спецыяльныя цыліндрычныя акулярныя і кантактныя лінзы. Паказаннямі да карэкцыі будзе зніжэнне вастрыні зроку, развіццё блізарукасці, хуткае стамленне вачэй падчас зрокавай работы.

**ПРЭСБІЯПІЯ.** Узроставае зніжэнне эластычнасці хрусталіка, якое перашкаджае звыклай раней зрокавай рабоце. Зрок удалечыню пры гэтым захоўваецца. У такім выпадку таксама прапануюцца лінзы і акуляры, аднак трэба разумець, што прэсбіяпія — не хвароба, паколькі ў яе аснове не паталагічныя змены ў воку, а ўзроставыя змяненні.

Для ўсіх станаў характэрна розная ступень парушэння зрокавых функцый. Таму толькі ўрач-афтальмолаг можа вызначыць, які від карэкцыі неабходны — акуляры, кантактныя лінзы або хірургія.



## Што шкодна для нашага зроку?

Нельга вылучыць якую-небудзь адну прычыну. Звычайна ўплываюць:

**1.** Недахоп вітамінаў і мінералаў, лішак харчовых хімічных дабавак.

**2.** Нізкая фізічная актыўнасць, курэнне, злоўжыванне алкаголем, шкодныя ўмовы працы.

**3.** Атрыманне ў спадчыну дрэннага зроку або фізіялагічнай схільнасці да яго.

**4.** Чытанне ў транспарце, які рухаецца, пры слабым асвятленні, у становішчы лежачы. Шматгадзіннае знаходжанне за камп'ютарам, тэлевізарам. Няправільная пасадка падчас чытання і пісьма.

**5.** Захворванні — атлусценне, цукровы дыябет, скаліёз, туберкулёз, інфекцыйны гепатыт, траўмы галаўнога мозга, захворванні насаглоткі і ротавай поласці (танзіліт, гаймарыт, адэноіды).

## І для маўлення, і для памяці

У 2-3 гады, як правіла, упершыню правяраюць вастрыню зроку дзіцяці. Далей наведванне афтальмолага павінна стаць штогадовым. Пры гэтым будуць ацэньвацца бінакулярныя функцыі, колеравы зрок, наяўнасць блізарукасці або дальназоркасці. Ранняя дыягностыка дазваляе не толькі выявіць захворванне, але і папярэдзіць адхіленні ў развіцці — рэзкае зніжэнне вастрыні зроку негатыўна ўплывае на фарміраванне маўлення, памяць, уяўленне.

## Рабіце так

Ужывайце цэльнае малако, тварог, кефір, вараную рыбу, ялавічыну, курыцу, індычку, моркву, капусту, зяленіва, ягады, садавіну, натуральныя сокі.

Не забывайцеся раніцай на гімнастыку, хадзіце ва ўмераным тэмпе 4 разы на тыдні па 30-40 хвілін. Школьнікам можна параіць не прапускаць урокі фізкультуры.

Не чытайце лежачы, у транспарце, пры дрэнным асвятленні, на баку. Гэта правакуе зрокавыя дыскамфорт і стомленасць, галаўны боль.

Штучнае асвятленне павінна быць злева. Прамыя промні святла не павінны трапляць у вока. Магутнасць лямпы — 60-80 Вт. Пры гэтым можа быць і агульнае асвятленне ў пакоі, неабходнае для таго, каб не стваралася рэзкі пераход падчас пераводу позірку з асветленай кнігі да цемры пакоя.

Вучобу і працу чаргуйце з адпачынкам і паўнацэнным сном.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

■ За кадрам

# СКРОЗЬ СМЕХ І СЛЁЗЫ — ДА МАРЫ,

## альбо Як праходзіць кастынг на шоу «Я спяваю»



▲ Маленькі канкурсант з Мінска спадабаўся журы не толькі выдатным выкананнем песні «Venus», але і танцам, які ён прыдумаў сам.

**Сцэна любіць таленавітых, настойлівых і працавітых. Аднак і без удачы тут не абысціся. Некаторым фартуна ўсміхнулася на мінулых выхадных на кастынгу праекта «Я спяваю!».**

Тэлеканал АНТ вось ужо пяты сезон рыхтуецца да таго, каб вывесці на сцэну новых юных артыстаў.

Каб даведацца, які шлях трэба прайсці, каб пачуць: «Чакайце! Калі вас выберуць, мы вам патэлефануем», — мы вырашылі папрысутнічаць на адборы і ўбачыць усё на свае вочы.

Каля ўваходу ў Нацыянальную школу прыгажосці шмат людзей. Мужчына спыняецца ля мяне і запытвае, з кім я прыйшла на конкурс? Я — сама (ну калі не лічыць фатографа), а ён прывёз унучку з Віцебска. І такіх дарослых «груп падтрымкі» было шмат. З'ехаліся з розных гарадоў і абласцей. Мамы і таты хваляваліся, мабыць, больш за саміх дзяцей. Сыны з дочкамі таксама перажывалі, некаторыя нават выходзілі ў слязах.

Кастынг для любога артыста — справа не з лёгкіх. На шоу «Я спяваю» проста так таксама не трапіць. Перш за ўсё трэба прайсці вакальны адбор. З чарговым прэтэндэнтам пераступаем парог, і нас сустракаюць выкладчыкі па вакале Аксана Баева і Раман Калодка (каардынатар праекта). Менавіта ад іх вердыкту залежыць, пойдзе кандыдат да наступных дзвярэй альбо адправіцца дадому з надзеяй вярнуцца ў наступны раз.

Дзяўчынка пачынае спяваць. Адну песню, другую, нават трэцюю спробу ёй даюць, але ў выніку ўсе разумеюць, што для праекта пакуль яшчэ вопыт не напрацаваны. Адмовілі. Варта зазначыць, што адмаўляюць тут нярэдка. А як інакш, калі нехта прыходзіць зусім не падрыхтаваным? Альбо ісці ідуць, а ці трэба ім той конкурс, самі дзеці не ведаюць. Вось перад выкладчыкамі ўжо іншая дзяўчынка — у сцэнічным касцюме, з вянком на галаве.

— Стань на крыжык і расказвай, што праспяваеш для нас, — звяртаецца Аксана Баева да юнай спявачкі.

Высвятляецца, што завуць удзельніцу Дарына Хайко, ёй 10 гадоў, і прыехала яна з Гомеля. Потым пачынае выконваць народную песню. Спявае дзяўчынка прыгожа, аднак яе спыняюць і просяць пачаць другі куплет спачатку, дэманструючы, дзе варта браць больш дакладна ноту. Удзельніца бярэ патрэбныя ноты ўслед за настаўнікамі — і праз некалькі імгненняў запаветная жоўтая стужка-«пропуск» на яе руцэ.



◄ Жоўты бранзалет-пропуск «Я спяваю», магчыма, стаў для Дарыны Хайко білетам на вялікую сцэну.

…Удзельнікі адбору змяняюць адзін аднаго, то радуючы, то расчароўваючы выкладчыкаў. Бывае ёсць жаданне спяваць, але адчуваецца адсутнасць падрыхтоўкі. А нехта спявае, здаецца, няблага, аднак хваляванне месцамі перашкаджае. Тады просяць паўтарыць за педагогам нейкую музычную фразу, што дапамагае зразумець, ці ёсць у дзіцяці адчуванне музыкі. Часам гэта і выратоўвае, і пераконвае даць юным выканаўцам шанц.




Самы просты спосаб даведацца, што адбываецца за дзвярыма.

— Мы глядзім у першую чаргу на вакальныя здольнасці, бо на праекце ў нас мала часу, каб займацца пастаноўкай голасу, — тлумачыць педагог па вакале Аксана Баева. — Стараемся зразумець, ці можна дзіця падрыхтаваць за кароткі час да выступлення на вялікай сцэне. На жаль, не можам усіх адабраць, аддаём перавагу самым яркім.

…Зайшла чарговая дзяўчынка і пачала спяваць «Мой родны кут, як ты мне мілы».

— Я нават мелодыю не пазнаю, пачні спачатку яшчэ раз, — просіць педагог.

Выкананне больш нагадвае прачытанне верша са спробай яго праспяваць. На просьбу выканаць нейкую іншую песню дзяўчына каже, што не падрыхтавала больш нічога. «Дзякуй, але будзем чакаць цябе ў наступны раз».

**Кастынг для любога артыста — справа не з лёгкіх. На шоу «Я спяваю» проста так таксама не трапіць. Перш за ўсё трэба прайсці вакальны адбор.**

Відавочна адно: калі ёсць талент і вакальная падрыхтоўка, то і шанц вам абавязкова дадуць. Так, хочацца спадзявацца, што запомняцца журы Ксенія Рэпіна (дзяўчынка спявала, як важна верыць у мару і не адпускаць яе), Аляксандра Прыходзька (выконвала народную песню і кампазіцыю ваеннай тэматыкі), Артур Пачтовы (хлопец выконваў песні на італьянскай і англійскай мовах, да таго ж артыстычна рухаўся, усміхаўся).

— Поспехаў табе, толькі не пераігрывай перад журы! — сказалі яму на развітанне.

Мы таксама вырашылі пайсці далей за маленькімі артыстамі, якія здабылі свой шчаслівы квіток на першым праслухоўванні. Візіт да псіхолага-рэдактара, варта сказаць, справа не менш адказная. З дзецьмі і бацькамі абмяркоўваюць пытанні, што датычацца і творчага патэнцыялу дзіцяці, і гісторыі яго сям'і. І вельмі важны аспект, ці гатовы яны расказаць яе на ўсю краіну.

— Мы даём шанц тым, у каго няма іншай магчымасці трапіць на вялікую сцэну. Ёсць розныя катэгорыі сем'яў, якія прыходзяць да нас, але аддаём перавагу праблемным і складаным сітуацыям, — тлумачыць псіхолаг-рэдактар Дар'я Ксянзова. — Сюды прыходзяць дзеці, якія добра спяваюць, а далей імкнёмся высветліць наколькі яны падыходзяць для праекта: па-першае, ці дастаткова камунікабельнае дзіця, па-другое, ці гатовыя родныя суправаджаць і падтрымліваць сына альбо дачку на нашым шоу. Разбіраемся таксама з гісторыяй і праблемамі сям'і, хаця па анкеце, што запаўняе кожны ўдзельнік, усё больш-менш зразумела.

Бываюць выпадкі, калі прэтэндэнты не зусім шчырыя, утойваюць нейкія факты пра сябе альбо дамалёўваюць тое, чаго няма ў сапраўднасці. Паколькі праект сацыяльнай накіраванасці, то тут імкнуцца дапамагчы тым, каму гэта насамрэч неабходна.

Накіроўваемся да, так бы мовіць, апошняй інстанцыі — журы кастынгу. Перад дзвярыма чакаюць канкурсанты. А ў пакоі прагляд і праслухоўванне праводзяць музычны кіраўнік праекта Святлана Стацэнка, аўтар і рэжысёр шоу Анжаліна Мікульская і харэограф «Я спяваю!» Вольга Шамрова. Тут юныя артысты спяваюць з мікрафонам, іх здымаюць на камеру. Словам, праверка гатоўнасці да сцэны па поўнай. Пры гэтым журы дае парады і, мабыць, адзначае пільным вокам, хто ж варты быць сярод запаветнай дзясяткі ўдзельнікаў шоу «Я спяваю» новага сезона.



Радасць і слёзы з маленькімі артыстамі дзялілі іх бацькі.

Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Па выніках кастынгу адабралі больш за сто чалавек. Далей іх анкеты і запісы выступленняў перагледзіць яшчэ раз вялікае прафесійнае журы. Некага запросяць прыехаць на прагляд паўторна. І толькі потым пачнецца адбор удзельнікаў шоу «Я спяваю!».

**Алена ДРАПКО**

**Святлана СТАЦЭНКА, музычны кіраўнік праекта «Я спяваю!»:**

— Пяты сезон — ужо амаль юбілейны. І цяпер мы адназначна можам казаць, што ў нас шмат таленавітых дзяцей. Вельмі прыемна бачыць разуменне з боку бацькоў і выкладчыкаў: яны прыводзяць на праект разняволеных, жывых дзяцей, якія без праблем працуюць акапэльна. Гэта неперадавальнае адчуванне — калі дзеці, якія фактычна прыходзяць «з вуліцы», у нас раскрываюцца, праяўляюць сябе. Бывае, я лаўлю сябе на думцы, што вучуся ў іх быць пазітыўнай у пэўных складаных сітуацыях. Мы дапаўняем адно аднаго. Таму, думаю, новы сезон адбудзецца, і будзе цікава.

**Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ, аўтар і рэжысёр праекта «Я спяваю!», дырэктар дырэкцыі спецыяльных праектаў тэлеканала АНТ:**

— Паколькі гэта пяты сезон праекта, то наша рэжысёрска-творчая група ўжо распрацоўвае план таго, у чым будзе адметнасць шоу на гэты раз. Хочацца звярнуць увагу на ўсе дасягненні тых канкурсантаў, якіх мы выпусцілі. Вядзецца праца і з артыстамі, якія будуць выступаць з новымі ўдзельнікамі «Я спяваю!». Госці будуць яркія. Думаю, і гісторыі, якія мы раскажам на гэты раз, таксама закрануць душы тых, хто захоча дапамагчы нашым дзецям, і дарослым дадуць магчымасць паглядзець на сваіх дзяцей іншымі вачамі.

■ Энтузіясты

# РАЗМАЎЛЯЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ Ў ПАЎСЯДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ

## навучыць жыхарка Гродна Таццяна Сушко



**Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага на сваім інтэрнэт-сайце (www.grodnolib.by) аб'явіла набор на курсы беларускай мовы на 2014/2015 навучальны год: «Запрашаем усіх, хто жадае навучыцца размаўляць па-беларуску ў паўсядзённым жыцці». З гэтай нагоды карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з арганізатарам курсаў Таццянай СУШКО.**

**Таццяна скончыла беларускамоўную школу ў вёсцы Славацічы Зэльвенскага раёна (цяпер яе ўжо няма — расфарміравана), філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, магістратуру па спецыяльнасці «мовазнаўства» і аспірантуру па спецыяльнасці «беларуская мова».**

— Я ўпэўнена, што гэта маё, гэта не прыцягнута «за вушы», каб толькі атрымаць адукацыю дзеля дыплома і ўладкавання на працу. Не, сапраўды было і ёсць вялікае ўнутранае жаданне распаўсюджваць беларускую мову, — кажа Таццяна Сушко. — Зараз я рыхтуюся да абароны дысертацыі і, каб практычна прымяніць свае веды, вырашыла арганізаваць курсы беларускай мовы ў Гродне. Чаму? Бо лічу, што той, хто жыве ў Беларусі, павінен ведаць гісторыю і культуру нашай краіны, валодаць беларускай мовай. Мяркую, што гэта вельмі патрэбна ў сучасным грамадстве, дзе мы ўсё больш сустракаемся з праблемамі спажывецкага характару. А тое, што ўзбагачае чалавечую натуру, робіць чалавека культурным, становіцца быццам другарадным. Хаця і не скажаш, што гэтыя каштоўнасці ўжо не запатрабаваны.

Прыгадваю нядаўні цікавы выпадак падчас паездкі ў аўтобусе. Побач са мной сядзеў мужчына і чытаў Быкава. Кажу яму: «Вельмі прыемна, што вы чытаеце беларускамоўную літаратуру». А ён мне адказвае: *«Я сюда приехал из России и удивился, что местные люди не разговаривают по-белорусски. И мне захотелось самому изучить белорусский язык, поскольку курсов в городе нет. Вот и читаю книги на белорусском языке».*

Ведаеце, мне нават стала сорамна, што я, ведаючы беларускую мову, нічога не раблю для людзей, якія маюць патрэбу ў яе вывучэнні. Гэта быў штуршок, каб прапанаваць сваю паслугу ўсім гродзенцам, хто хоча навучыцца размаўляць па-беларуску ў паўсядзённым жыцці. Я так і напісала ў аб'яве. Будзем закранаць на занятках усе бытавыя сітуацыі, лексіку, якая гэтыя сферы абслугоўвае. Таксама не забудзем пра гісторыю і культуру. Заняткі будуць праходзіць цікава, бо другую палову мяркую зрабіць інтэрактыўнай. Гэта значыць, што тэарэтычныя веды адразу ж замацуем практыкаваннямі.

**«Мне падабаецца нават тое, што ў беларускай мове няма нецэнзурнай лексікі. І нават калі б ты хацеў пасварыцца па-беларуску, то ў цябе не надта атрымаецца».**

**— Курсы разлічаны на жадаючых пашырыць сваё веданне беларускай мовы ці на тых, хто ёю наогул не валодае?**

— Гэта курсы для ўсіх, нават для тых, хто зусім не ведае беларускай мовы. Заняткі будуць пабудаваны так, што загаворыць кожны — было б толькі жаданне. Чаму я так лічу? У людзей, якія нарадзіліся ў нашай мясцовасці, беларускамоўны патэнцыял ужо закладзены. Бо ў многіх прадзеды, дзяды, бацькі размаўлялі па-беларуску і яны чулі гэтую гаворку, памятаюць яе. Яны ўжываюць рускую мову, якая, па сутнасці, і не з'яўляецца да канца рускай. Мы, беларусы, карыстаемся мясцовым варыянтам рускай мовы, які адрозніваецца ад таго, на якім размаўляюць сапраўдныя носьбіты. Таму нашаму земляку не будзе цяжка загаварыць па-беларуску, калі ў яго сапраўды ёсць жаданне рабіць гэта ў паўсядзённым жыцці.

А для тых, хто не нарадзіўся ў нашай краіне і хоча вывучыць беларускую мову, гэта таксама не складзе цяжкасцяў. Акрамя тэарэтычных заняткаў, я прапаную чытаць беларускую літаратуру, часопісы, газеты. І калі ў чалавека будзе такое жаданне, то ён таксама загаворыць па-беларуску. Мяркую, што людзі, якія прыйдуць на курсы, будуць сапраўды жадаць навучыцца.

Пры гэтым ніякіх абмежаванняў па ўзросце для наведвальнікаў курсаў няма.

**— Нават для дзяцей?**

— Гэтыя курсы разлічаны на дарослых. Але я таксама зрабіла аб'яву асобна для маленькіх. Пакуль ніводнага званка яшчэ не было. Але спадзяюся, што людзі, якія прыйдуць на курсы для дарослых, захочуць, каб і іх дзеці навучыліся размаўляць па-беларуску.

**— Вас падтрымліваюць сябры і знаёмыя?**

— Яны таксама спрабуюць размаўляць па-беларуску. Хаця б са мной, ведаючы, што мне будзе прыемна. А некаторыя, як і я, пачынаюць цвёрда трымацца беларускай мовы. Я лічу, што калі не на «трасянцы» размаўляць, а на літаратурнай мове, то яна вельмі прыгожая, адна з самых мілагучных у свеце. Мне падабаецца нават тое, што ў беларускай мове няма нецэнзурнай лексікі. І нават калі б ты хацеў пасварыцца па-беларуску, то ў цябе не надта атрымаецца.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

Даты | Падзеі | Людзі

**1893** год — нарадзілася (вёска Будслаў, цяпер Мядзельскі раён) Паўліна Вікенцьеўна Мядзёлка, заслужаная дзеячка культуры Беларусі (1966). Унесла значны ўклад у развіццё беларускага тэатральнага мастацтва. Член Віленскага музычна-драматычнага гуртка і Першага таварыства беларускай драмы і камедыі. Адна з першых выканала ролю Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Я. Купалы. Арганізавала харавы і драматычны гурткі ў Гродне, у Дзвінскай беларускай гімназіі, у Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, Будславе. Пісала вершы, паэмы, песні, п'есы. Аўтарка ўспамінаў. Памерла ў 1974 годзе.

**1896** год — нарадзіўся Фрэнсіс Фіцджэральд, амерыканскі пісьменнік. Ён вызначаўся дзіўным поглядам на рэчы і рамантычным успрыманнем свету. У 20-я гады мінулага стагоддзя Фіцджэральд быў адным з самых высокааплатных аўтараў вядомых часопісаў краіны. Але больш за ўсё ён праславіўся як аўтар раманаў пра жыццё Амерыкі. Самы вядомы з іх — «Вялікі Гэтсбі». Працуючы сцэнарыстам Галівуда, Фіцджэральд напісаў раман пра жыццё гэтай кінафабрыкі — «Апошні магнат». Правобразам яго галоўнага героя быў вядомы рэжысёр Ірвінг Талберг. За тры гады працы ў Галівудзе пісьменнік напісаў серыю апавяданняў і артыкулаў, у асноўным аўтабіяграфічнага характару, якія былі апублікаваны ўжо пасля яго смерці.



**1949** год — 65 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Уладзіміравіч Анічкін, беларускі хірург, доктар медыцынскіх навук (1988), прафесар (1989), ганаровы доктар Масачусецкага тэхналагічнага інстытута (1990). У 1972 годзе скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут. Аўтар навуковых прац па дыягностыцы, лячэнні і прафілактыцы пасляаперацыйных ускладненняў пры язвавай хваробе дванаццаціперснай кішкі, у пластычнай хірургіі. Прапанаваў спосабы пратэзавання трахеі.

Было сказана

**Стэфанія СТАНЮТА, народная артыстка Беларусі:**

*«Калі не цікава з самім сабою — не цікава і іншым з табою».*

НАРОДЖАНЫЯ 24 верасня

**Тэма вандровак і прыгод знаходзіць рэальнае адлюстраванне ў жыцці гэтых людзей. Чытанне авантурных раманаў, разважанні аб гераічным лёсе, наведванне незнаёмых краін і гарадоў — гэтыя віды дзейнасці выклікаюць у іх надзвычайную цікавасць. Ім вельмі цяжка дагадзіць у сямейных пытаннях, з імі цяжка знайсці агульныя пункты гледжання і размаўляць на іх мове, таму што яны патрабуюць залішняй увагі да сябе. Большасць з іх маюць гуманітарны склад розуму. Некаторыя могуць лічыць іх дзіўнымі, але тым не менш яны сапраўды верныя сябры са шчырым сэрцам. Яны дазваляюць іншым адчуць прыгажосць жыцця, што само па сабе ўжо не дрэнна.**

■ Небяспека

# ХІМЗБРОЮ АБЯСШКОДЗІЛІ

Гліняныя бутэлькі з ядавітым рэчывам былі знойдзены ў Жлобіне. У райцэнтры капалі траншэю пад вадаправод, калі было знойдзена пяць ёмістасцяў з нямецкай хімзброяй часоў Вялікай Айчыннай вайны — адамсітам. Бутэлькі з запальнай сумессю пад хімічнай назвай дыгідрафенарсазінхларыд супрацоўнікамі МНС былі змешчаны ў бочку з пяском для вызначэння шляхоў далейшай утылізацыі. На месца здарэння выязджала і група размініравання в/ч 5527 з Бабруйска. Вядома, што адамсіт быў распрацаваны ў якасці хімічнай зброі ў Германіі яшчэ падчас Першай сусветнай вайны і дагэтуль знаходзіцца ў арсенале войскаў многіх дзяржаў. Атрутныя рэчывы ў атмасферу не трапілі, — адзначылі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.58 | 19.04 | 12.06 |
| Віцебск — | 6.48 | 18.53 | 12.05 |
| Магілёў — | 6.48 | 18.54 | 12.06 |
| Гомель — | 6.45 | 18.50 | 12.05 |
| Гродна — | 7.14 | 19.19 | 12.05 |
| Брэст — | 7.14 | 19.20 | 12.06 |

**Месяц**

***Маладзік у 19.13.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Віктара, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея.*
***К.*** *Марыны, Яніны, Герарда, Германа, Тодара.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## …у суседзяў

| Горад | Тэмпература |
|---|---|
| ВАРШАВА | +7..+9°C |
| ВІЛЬНЮС | +12..+14°C |
| КІЕЎ | +11..+13°C |
| МАСКВА | +11..+13°C |
| РЫГА | +12..+15°C |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +11..+13°C |

УСМІХНЕМСЯ

Муж, назіраючы, як жонка раскладвае касметыку, вырашыў высветліць, што і для чаго ёй трэба. Тая тлумачыць:

— Ну вось глядзі: спачатку мыюся пенкай, потым — скраб; далей — тонік, крэм, аснова для макіяжу, танальны крэм, а затым пудра.

— А навошта ўсё гэта?

— Каб атрымаўся натуральны колер твару.

**У сяброўкі ўкралі ліхтарык, які яна сама ўкрала. Такіх абурэнняў я яшчэ ніколі не чула...**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.051. Індэкс 63850. Зак. № 3905.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2014 года.